Салдатамі не нараджаюцца

СТАР. 3

Беларусь на палотнах мастакоў

СТАР. 5

Хто паедзе на Еўрабачанне?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

20 СНЕЖНЯ 2014 г. СУБОТА № 242 (27852) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ГОДНА ПЕРААДОЛЕЦЬ ЦЯЖКАСЦІ

З пачатку будучага года строгая эканомія будзе галоўным кірункам работы

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, наведваючы Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўжо даў распараджэнне ўсім дзяржаўным органам і структурам па скарачэнні матэрыяльнага забеспячэння ў два разы. Пры гэтым ён падкрэсліў, шо гэта не датычыцца заработнай платы. «Мы ўжо дайшлі да таго, што ў нас усе, хто можа, павінен і не павінен, ездзяць на персанальных аўтамабілях. А бензін сёння каштуе нятанна. Вось, здавалася б, дробязь, а ўсе хочуць мець дастойную зарплату і танныя крэдыты на жыллё як мінімум, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта правільна. Таму заработную плату і жыллё мы будзем падтрымліваць, а дзе можна скараціцца — там трэба абавязкова скарачацца, аптымізавацца».

«Колькі б у нас грошай ні было, мы будзем эканоміць, дзе толькі можна. Чаму? Ну, хопіць ужо куляцца з гэтымі валютамі. Трэба зразумець адно: калі мы хочам стабільнасці на валютным рынку, то, пачынаючы з простага грамадзяніна, нас з вамі, і завяршаючы юрыдычнымі асобамі, кожны павінен хоць па капеечцы ўносіць у рэзерв дзяржавы. Калі гэта будзе — будзе стабільнасць. А калі будзе, што адны прыносяць у краіну валюту і грошы, а другія проста прыходзяць у абменнікі, іх скупляюць і працяць або кладуць у панчоху, тады і краіна будзе так куляцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што ў Беларусі дастаткова сіл, каб прайсці цяперашні перыяд спакойна. «Вы не перажывайце: што б ні здарылася ў нашай краіне, нават калі горшы сцэнарый будзе, мы ўсё роўна за паўгода стабілізуемся дзякуючы той сістэме, якая ў нас у Беларусі створана, — жорсткай сістэме вертыкалі ўлады, жорсткіх патрабаванняў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што апошнім часам было прынята мноства рашэнняў, у тым ліку па ўзмацненні адказнасці кіраўнікоў працоўных калектываў, па кантролі за цэнаўтварэннем і іншых. «І калі, не дай бог, сітуацыя недзе захістаецца, мы ўключым усе гэтыя рычагі, імгненна ўключым, і стабілізуемся, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы ўсё роўна з любой сітуацыі выкарабкаемся, таму што мы ўжо не тыя, што былі дзясятак, а, можа, і два дзясяткі гадоў таму».

«Калі нехта ўнутры і за межамі нашай краіны, а ствараецца гэты ажыятаж у нас выключна пад уздзеяннем знешніх абставін, хоча нас дэстабілізаваць — не атрымаецца!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. «Таму не трэба ахаць, вохкаць, трэба рыхтавацца да Новага года і Каляд», — дадаў Прэзідэнт.

«Як я ўжо сказаў, кіраўніцтва Нацыянальнага банка, урад ды і я не зацікаўлены ў тым, каб бегчы следам за Расіяй і Украінай. Мы не хочам капіраваць тое, што адбываецца ў нашых суседзяў, у нашых братоў, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы з усіх сіл, не маючы такіх вялікіх рэзерваў, дапусцім, як Расійская Федэрацыя, сцяўшы зубы, трымаемся».

«І я нездарма сказаў, што ў гэтым выпадку сітуацыя вельмі сур'ёзная, усё залежыць ад нашых людзей: будзе дэвальвацыя, не будзе, абрушым, не абрушым, абвалім, не абвалім. Гэта нашы людзі, я ў свой час аб гэтым ужо гаварыў: не бегайце як апантаныя з гэтым рублём па абменніках і не абменьвайце на валюту, не таргуйце, таму што гэта будзе мець наступствы», — сказаў Прэзідэнт. «Людзі ж не разумеюць, а можа, не хочуць разумець, што ў гэтага працэсу ёсць адваротны канец, які ўдарыць іх і нас па галаве, — гэта павелічэнне попыту на валюту. А калі попыт павялічыўся, значыць, павялічваецца цана валюты», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, пры свабодным рыначным працэсе абмену валюты і ў іншых сектарах таксама павінна быць свабода. «Мы не можам рэгуляваць тут, а там адпускаць, даваць поўную свабоду. Мы не можам тут куплю-продаж зрабіць свабоднымі, а недзе нешта стрымліваць. Калі свабодна — значыць, свабодна», — сказаў Прэзідэнт. «Для нас цяпер галоўнае — не дапусціць абвалаў, не кінуцца ў вір за Расіяй, таму што мы не ведаем, які там будзе рубель і г.д. Мы ведаем адно: што мы нясём вялікія страты ў сувязі з абвалам расійскага рубля, таму што гэта наш асноўны рынак», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён дадаў, што на Расію прыпадае 42 працэнты беларускага экспарту і амаль 15-20 працэнтаў — на Украіну.

«Гэта значыць, сітуацыя няпростая. І, сказаўшы людзям аб тым, што мы не хочам, каб у нас рэзка абвалілася нацыянальная валюта, нам хацелася б прайсці гэты перыяд вось такім чынам спакойна. Пакуль у нас сіл для гэтага хапае», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Напярэдадні кіраўнік дзяржавы на нарадзе даручыў Нацбанку і ўраду прадугледзець шэраг мер спакойнага характару па захаванні золатавалютных рэзерваў. «Я думаю, што Нацбанк і ўрад у бліжэйшы час будуць пастаянна інфармаваць насельніцтва, суб'екты гаспадарання аб прымаемых мерах», — дадаў ён.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паведаміў аб сваім намеры сустрэцца ў нядзелю з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам. «Ён учора патэлефанаваў мне і папрасіў, каб мы неяк сустрэліся, перагаварылі па некаторых пытаннях, ды і я выказваў жаданне, таму што нам ёсць аб чым пагаварыць у гэтай сітуацыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Зыходзячы з гэтай размовы, я зразумеў, што ўкраінскае кіраўніцтва (у прыватнасці, прэзідэнт Украіны) абсалютна не з'яўляецца перашкодай да пачатку новага раўнда перагавораў у Мінску», — адзначыў беларускі лідар. «Як ён сказаў, ён чакае цяпер рэакцыі з боку кіраўнікоў Луганскай і Данецкай рэспублік». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што самае галоўнае — гэта дыялог. «Як бы ні было складана, я разумею і прэзідэнта Украіны, але іншага шляху, як садзіцца за стол перагаворaў і весці дыялог, ні ў яго, ні ў кіраўнікоў Данецка і Луганска няма. Трэба размаўляць. Усё роўна некалі будзе мір. Але нельга далей ісці шляхам эскалацыі і гібелі ні ў чым не вінаватых людзей», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

***

Падчас наведвання Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Прэзідэнт азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай камітэта і ўмовамі працы. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што рашэнне аб утварэнні камітэта было правільным. «Аб'ектыўнасць, незалежнасць працэсаў у нас набылі сусветны ўзровень. Сумленнасць, аб'ектыўнасць — вышэйшыя, чым у любой краіне, я гарантую. І я за гэтым пільна сачу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Нас усё папракаюць у нейкай дыктатуры. Так, у нас ёсць жорсткая дыктатура праўды», — сказаў ён. «Вы сталі самастойнай структурай, таксама, як Следчы камітэт. У следчым працэсе сёння кожны выконвае сваю ролю. У гэтым ёсць сутнасць правоў чалавека ў такім складаным працэсе. Кожны чалавек у краіне можа разлічваць на поўную аб'ектыўнасць і незалежнасць таго ці іншага органа», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў сцяг Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і грамату Прэзідэнта Беларусі старшыні камітэта.

■ Парламенцкі дзённік

Неабходна адаптацыя да знешніх і ўнутраных умоў

Учора на сумесным пасяджэнні дзвюх палат парламента віцэ-прэм'ер Пётр ПРАКАПОВІЧ агучыў вынікі 2014 года і праграму па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны ў 2015 годзе. Пасля чаго на заключных пасяджэннях пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў і шостай сесіі Савета Рэспублікі быў разгледжаны дэкрэт Прэзідэнта №5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый» і ратыфікаваны дагавор аб далучэнні Рэспублікі Арменія да дагавора аб ЕАЭС. Верхняя палата парламента таксама ўхваліла бюджэтны пакет законапраектаў на наступны год.

НЯПРОСТЫ НОВЫ ГОД

Ва ўрадзе чакаюць, што ў 2015 годзе прыйдзецца вырашаць яшчэ больш складаныя задачы, бо сітуацыю ва Украіне і Расіі па-ранейшаму складана спрагназаваць. Да таго ж, ва ўласнай краіне дастаткова ўнутраных пытанняў, якія трэба вырашаць.

«У 2015 годзе ўпершыню запланаваны тэмп росту ВУП на ўзроўні 100,2-100,7% і упершыню плануем зніжэнне экспарту нашых тавараў і паслуг, — сказаў віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч. — Гэта мінімальныя паказчыкі, але мы павінны рабіць усё неабходнае для таго, каб рэальныя дасягненні былі адносна вышэйшымі».

У сувязі з гэтым, на думку Пятра Пракаповіча, трэба адаптавацца да знешніх і ўнутраных умоў і зрабіць усё неабходнае для таго, каб забяспечыць у наступным годзе тэмп росту рэальных даходаў насельніцтва ў памеры не менш за 101-102% і забяспечыць збалансаванасць эканомікі. Адной з найважнейшых задач на 2015 год з'яўляецца дасягненне станоўчага сальда знешняга гандлю.

«Хоць мы і плануем адмоўнае сальда, але павінны па максімуме нарошчваць экспарт і скарачаць імпарт, каб у выніку атрымаць станоўчае сальда. Гэта будзе асновай для збалансаванасці нашай эканомікі», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра. Таксама Пётр Пракаповіч лічыць, што неабходна павысіць канкурэнтаздольнасць эканомікі краіны, айчынных тавараў і паслуг.

«Мы губляем сёння і знешні, і ўнутраны рынкі з-за таго, што недастаткова высокі ўзровень канкурэнтаздольнасці нашых тавараў і паслуг. На жаль, кожны год павялічваем імпарт тавараў унутры краіны, але гэтую тэндэнцыю трэба ў наступным годзе спыніць і імпарт скараціць», — растлумачыў віцэ-прэм'ер.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Андрэй Шорац назначаны членам Савета Рэспублікі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў старшыню Мінскага гарвыканкама Андрэя Шорца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Рукатворныя падарункі

Фота БЕЛТА.

У Мінску пачала сваю працу выстава вырабаў ручной работы «Млын».

У АДЗІНСТВЕ І КАНСАЛІДАЦЫІ — НАША СІЛА

Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава А.М. на закрыцці шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 19 снежня 2014 г.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі, запрошаныя і журналісты!

Сёння мы завяршаем работу шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. У сувязі з гэтым хацеў бы падвесці вынікі нашай дзейнасці за гэты перыяд, коратка спыніцца на некаторых падзеях у нашай краіне і за мяжой, а таксама абазначыць асобныя задачы на міжсесійны перыяд.

Безумоўна, адной з найважнейшых, я сказаў бы, лёсавызначальных падзей для нашай краіны ў адыходзячым годзе стала ратыфікацыя Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. З 1 студзеня 2015 года для Беларусі, Расіі, Казахстана, а таксама Арменіі, якая далучаецца да гэтага саюза, пачынаецца прынцыпова новы этап развіцця інтэграцыйных узаемаадносін. У адпаведнасці з дагаворам краіны ствараюць адзіны 170-мільённы рынак для свабоднага перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы. Няма сумненняў, што такі эканамічны саюз — гэта добра для нашых народаў, тым больш што ён заснаваны на даўніх дружалюбных сувязях паміж нашымі краінамі.

Разам з тым трэба разумець, што ў працэсе функцыянавання Еўразійскага эканамічнага саюза могуць узнікаць пэўныя цяжкасці і праблемы. Гэта цалкам зразумела, паколькі наладка такога складанага інтэграцыйнага механізма запатрабуе часу. Важна толькі, каб усе ўзнікаючыя праблемы вырашаліся на раўнапраўнай аснове, у духу дружбы і ўзаемнай павагі. А галоўнае, на аснове строгага выканання падпісаных пагадненняў, якія былі адобраны парламентамі ўсіх краін і, значыць, маюць сілу закону. Такая пазіцыя нашага Прэзідэнта, такая пазіцыя нашай краіны.

СТАР. 2

АДСТОЙВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ

Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на закрыцці пятай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання

Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Пятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання завяршае сваю работу.

Пройдзены своеасаблівы «экватар» у нашай дзейнасці. За два гады парламент наладзіў сістэмную, зладжаную работу, вырас у прафесійным плане. Прынята больш за 200 запатрабаваных дзяржавай і грамадствам законаў, істотна пашыраны сувязі з замежнымі парламентамі і міжпарламенцкімі арганізацыямі.

Даволі выніковай была і бягучая сесія. Прынята каля 70 законапраектаў. Асноўны акцэнт пры гэтым зроблены на выкананні пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач па абароне суверэнітэту і адстойванні нацыянальных інтарэсаў.

Рызыкі, звязаныя з запаволенням тэмпаў росту сусветнай эканомікі, нестабільнасцю рынкаў, спадам попыту на прамысловую прадукцыю, патрабуюць ад нас прыняцця неадкладных мер. Толькі моцная, устойлівая эканоміка служыць надзейным гарантам высокіх стандартаў жыцця, захавання грамадскай згоды, а значыць, — і незалежнасці.

Ключавое значэнне ў гэтых адносінах мае прыняцце пакета бюджэтных дакументаў на 2015 год. З улікам няпростых знешнеэканамічных умоў фінансавыя рэсурсы краіны сканцэнтраваны на выкананні задач захавання макраэканамічнай стабільнасці, развіцця рэальнага сектара, стымулявання экспарту.

Прынцыпова важна, што бюджэт дае магчымасць забяспечыць выкананне сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы. У мэтах узмацнення абароны найбольш слабаабароненых катэгорый насельніцтва прадугледжаны такія формы дзяржаўнай падтрымкі сям'і, як фарміраванне «сямейнага капіталу», прадастаўленне льготнага крэдыту на будаўніцтва або набыццё жылля сем'ям, якія выхоўваюць дваіх непаўналетніх дзяцей.

СТАР. 2

■ Грашовая палітыка

ВАЛЮТНЫМ МАХІНАЦЫЯМ «ПАДРЭЗАЛІ КРЫЛЫ»

Цяпер у абменніках пакупнікі замежных грошай часова будуць аплачваць яшчэ і 30% камісіі, якія пойдуць у бюджэт краіны

Зыходзячы з сітуацыі, якая складваецца ў эканоміках сумежных дзяржаў, і ў першую чаргу — у Расійскай Федэрацыі, урадам і Нацыянальным банкам краіны прыняты шэраг мер, накіраваных на недапушчэнне развіцця негатыўных тэндэнцый на валютным і фінансавым рынках Беларусі і павышэнне прывабнасці зберажэнняў у нацыянальнай валюце. Пра гэта паведаміў учора на брыфінгу першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тарас НАДОЛЬНЫ.

ПРЫВАБНАСЦЬ ДЭПАЗІТАЎ У РУБЛЯХ

Цяпер сваім рашэннем Нацыянальны банк павышае да 50% гадавых працэнтныя стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў. Гэта, у сваю чаргу, прывядзе да прапарцыянальнага павелічэння ставак па дэпазітах у нацыянальнай валюце. Больш за тое, сёння ўсімі буйнымі беларускімі банкамі ўводзіцца тэрміновы гарантаваны ашчадны ўклад з механізмам індэксацыі рублёвых зберажэнняў пры змене абменнага курсу беларускага рубля. Гэта робіць зберажэнні ў нацыянальнай валюце абароненымі ад курсавых рызык і павышае іх прывабнасць у параўнанні з замежнай валютай.

БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ, АЛЕ З КАМІСІЯЙ

З улікам узрослага попыту на замежную валюту на ўнутраным валютным рынку прынята сумеснае рашэнне аб часовым увядзенні 30% збору пры куплі валюты юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Прадпрыемствы і банкі будуць выплачваць гэты збор пры набыцці валюты на біржы, а грамадзяне — у выглядзе камісіі пры куплі ў банках. Выплачаныя сродкі будуць накіроўвацца ў бюджэт. Такім чынам, дадаткова атрыманыя грошы ад продажу валюты не застануцца ў банках, а будуць накіраваны на далейшае развіццё нашай эканомікі.

Пры гэтым падыходы да курсаўтварэння на ўнутраным валютным рынку застануцца нязменнымі. Любы грамадзянін зможа здзяйсняць куплю і продаж валюты без абмежаванняў, суб'екты гаспадарання — на Беларускай валютна-фондавай біржы. Ажыццяўленне аперацый куплі-продажу замежнай валюты суб'ектамі гаспадарання — рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь на пазабіржавым валютным рынку часова прыпыняецца. Для суб'ектаў гаспадарання існуе толькі адно выключэнне. Новы механізм канвертацыі замежнай валюты не будзе выкарыстоўвацца ў тым выпадку, калі яна пойдзе на куплю электрычнасці, газу і нафты за межамі краіны.



А вось купляць валюту з мэтай наступнага продажу па больш высокім курсе стала цяпер бессэнсоўна, лічыць **першы намеснік кіраўніка Апарату Савета Міністраў — кіраўнік сакратарыята прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ.**

«Цяпер у кожнага эканамічнага агента ёсць выбар: захаваць дэпазіты ў беларускіх рублях па стаўцы каля 50% (гэта значыць, з сур'ёзнай прыбытковасцю) альбо змясціць грошы на ўклад «Гарант», дзе яны застрахаваны ад курсавых рызык. Калі ж грамадзянін выбірае куплю валюты, то павінен заплаціць камісію».

СТАР. 2

У АДЗІНСТВЕ І КАНСАЛІДАЦЫІ — НАША СІЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб пазбегнуць у будучым якіх-небудзь інцыдэнтаў, якія маглі б перашкодзіць нашым інтэграцыйным намаганням, неабходна, каб любыя непаразуменні ў сферы гандлёва-эканамічных адносін краін-партнёраў вырашаліся не ў аднабаковым парадку, а на аснове разгляду гэтых пытанняў інтэграцыйнымі органамі кіравання Еўразійскага эканамічнага саюза, якія спецыяльна для гэтых мэт і былі створаны.

Вы разумееце, што я маю на ўвазе няздаўнія выпадак, калі Расія ў асобе канкрэтнага ведамства — Рассельгаснагляда — у адзін момант забараніла пастаўкі ў краіну мясной і малочнай прадукцыі адразу больш як дваццаці беларускіх прадпрыемстваў. Я не буду паглыбляцца ў дэталі і прычыны такіх рашэнняў — гэта тэма дастаткова падрабязна абмяркоўвалася ў СМІ. Ды справа тут і не ў дэталях. Справа ў маштабах і форме такога рашэння, якое наш народ расцаніў не інакш як нейкі недружалюбны крок у адносінах да Беларусі. Спадзяюся, што гэты канфлікт будзе ў бліжэйшы час поўнасцю вычарпаны.

Думаю, што нам усім трэба вынесці з яго сур'ёзныя ўрокі і не дапускаць такіх з'яў у будучым. Трэба зрабіць усё, каб тыя вялікія надзеі, якія народы нашых краін ускладаюць на Еўразійскі эканамічны саюз, не ўступілі б месца расчараванню. А для гэтага ўсім удзельнікам еўразійскага рынку трэба на першае месца ставіць не скарацечныя эгаістычныя выгады, а сумеснае развіццё перспектыўных і ўзаемавыгадных магчымасцяў, якія адкрываюцца ў рамках новай інтэграцыйнай структуры.

Але ў сувязі са згаданым інцыдэнтам узнікае і іншая праблема, а менавіта — праблема якасці прадуктаў харчавання, якія паступаюць на нашы прылаўкі.

Гэта найважнейшае пытанне, ад якога залежыць здароўе нашай нацыі і ад якога нашы парламентарыі не павінны стаяць убаку. І гэта пытанне мае два складнікі — якасць прадуктаў харчавання, якія вырабляюцца ў нашай краіне, і прадуктаў, што імпартуюцца з краін Еўразійскага эканамічнага саюза.

Вядома, са свайго боку мы павінны прыняць усе меры для таго, каб на беларускіх прадпрыемствах выключыць нават самыя малыя парушэнні тэхналогіі на ўсіх этапах вытворчасці, захоўвання і рэалізацыі прадукту. Неабходна яшчэ раз прайсціся па ўсіх нашых вытворчасцях і яшчэ раз вельмі строга праверыць выкананне імі ўсіх санітарна-эпідэміялагічных норм.

Але як быць з прадуктамі харчавання, якія завозяцца, скажам, з Расіі? У Беларусі ж, у адпаведнасці з патрабаваннямі кіраўніка нашай дзяржавы, зыццёва важныя прадукты харчавання вырабляюцца ў строгай адпаведнасці з нормамі ДАСТа. А гэтыя нормы цалкам выключаюць падмену натуральных інгрэдыентаў, устаноўленых рэцэптурай, якімі-небудзь заменнікамі больш нізкай якасці. Напрыклад, ніхто ў нас не мае права замяніць у каўбасе мяса на сою, сланечнікавы алей — на пальмавы, уводзіць у прадукты лішнія, шкодныя для здароўя дабаўкі і г.д. і да т.п. Гэта значыць, у адпаведнасці з законам беларускія прадукты павінны мець дастаткова высокую якасць і не павінны змяшчаць шкодных заменнікаў і дабавак. А калі нехта недзе недапрацаваў, парушыў тэхналогію, значыць, ён парушыў закон.

У Расіі ж сітуацыя зусім іншая. Там прадпрыемствы маюць права вырабляць прадукцыю не ў адпаведнасці з ДАСТам, а па тэхнічных умовах, якія кожнае прадпрыемства ўстанаўлівае само для сябе. Гэта значыць, закон не забараняе вытворцу выкарыстоўваць замест натуральнай сыравіны тыя ці іншыя заменнікі, не ўстанаўлівае строгай прапорцыі паміж харчовымі інгрэдыентамі нават у прадуктах адной маркі, прадастаўляе большую свабоду для прымянення розных дабавак, часта шкодных для здароўя чалавека. А калі ўсе гэтыя дабаўкі і будуць надрукаваны на ўпакоўцы дробным шрыфтам, то не кожны пакупнік можа ў іх разабрацца.

Трэба адзначыць, што расійская грамадскасць сама вельмі заклапочана якасцю сваіх прадуктаў харчавання і даўно настойвае на заканадаўчым увядзенні ў гэтай сферы ДАСТа замест ТУ. Але пакуль пытанне не вырашана. І ў расійскіх СМІ па-ранейшаму бурна абмяркоўваюцца шматлікія факты нізкай якасці і нават небяспечнасці вырабляемых там прадуктаў для здароўя людзей.

Таму выклікае пэўную трывогу тое, што з пачаткам функцыянавання Еўразійскага эканамічнага саюза расійская прадукцыя, у тым ліку і тая, што не адпавядае прынятым у нас патрабаванням, можа хлынуць на нашы прылаўкі. І нам, парламентарыям, трэба ўжо цяпер думаць аб тым, як на заканадаўчым узроўні адрэгуляваць гэту сітуацыю з тым, каб наша насельніцтва не пацярпела ад завозімых няякасных прадуктаў харчавання.

Але, у рэшце рэшт, гэта ўсё прыватныя, хоць і немалаважныя для нас праблемы. Усе яны могуць і павінны знайсці сваё рашэнне, не тармозячы і не аслабляючы агульнага руху ў бок нашай інтэграцыі.

Галоўнае — у іншым. Сёння міжнародная абстаноўка настолькі ўскладнілася, настолькі ўзмацніліся канфрантацыйныя працэсы паміж Захадам і Расіяй, што любыя, нават дробныя супярэчнасці, калі яны ўзводзяцца ў прынцып, могуць спарадзіць элементы недаверу паміж саюзнікамі, а значыць, аслабіць пазіцыі не толькі самой Расіі, але і Саюзнай дзяржавы, і навастворанага Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэтага нам дапусціць нельга.

Сёння ў свеце ідзе вялікая палітычная гульня з вялікімі стаўкамі. І наколькі ў ёй удасца выстаяць, адстаяць свае інтарэсы, правы і пазіцыі, у многім залежыць ад адзінства нашых краін, нашых брацкіх народаў і нашых кіраўнікоў. Гэта выклік гісторыі, яго трэба прымаць сур'ёзна, і яму трэба процістаяць усім разам. Сёння не час для дробязных разладаў, асобасных амбіцый або эгаістычных памкненняў тых ці іншых суб'ектаў гаспадарання, якімі ўплывовымі яны ні былі б. Гісторыя не даруе нікому з нас, калі мы не знойдзем у сабе дастаткова мудрасці для таго, каб, адкінуўшы ўбок усё дробязнае і другараднае, забяспечыць неабходнае адзінства і з'яднанасць ва ўсіх нашых дзеяннях.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Падводзячы вынікі нашай работы за перыяд шостай сесіі Савета Рэспублікі, спынюся на асабліва важных напрамках нашай дзейнасці. Перш за ўсё адзначу, што намі прынята 66 пастаноў Савета Рэспублікі, адобрана 52 законапраекты, у тым ліку 24 аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў, прыняты да ведама 2 дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На сесіі адобраны такі важны для нашай краіны законапраект, як рэспубліканскі бюджэт на 2015 год, які сфарміраваны на аснове параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця і грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і з улікам ацэнкі выканання бягучага бюджэту. Адначасова ўнесены змяненні і дапаўненні ў Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь, дзякуючы якім будуць вырашаны праблемныя пытанні ў галіне падаткаабкладання і спрошчаны парадак вылічэння і выплаты канкрэтных падаткаў.

Я не буду пералічваць усе законы, якія мы з вамі прынялі ў перыяд гэтай сесіі. Вы іх усе добра ведаеце, нагадаю толькі аб некаторых з іх, якія таксама вельмі важныя для нашага грамадства. Да іх належаць законы аб энергазбяражэнні, аб гарантаваным кампенсаванні банкаўскіх укладаў фізічных асоб, аб лекавых сродках, аб рынку каштоўных папер і шэраг іншых.

Вялікае значэнне маюць змяненні і дапаўненні, якія былі ўнесены ў шэраг заканадаўчых актаў. Яны закранулі самыя розныя сферы жыццядзейнасці грамадства: работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання, правядзенне кадастравай ацэнкі зямлі, работу чыгуначнага транспарту, пахавальную справу, бяспеку суднаходства маламерных суднаў, паляванне і рыбалоўства, ахову жывёльнага і раслінага свету, забеспячэнне пагранічнай бяспекі, пытанні ваеннага становішча, воінскага абавязку, сродкаў масавай інфармацыі, процідзеяння гандлю людзьмі і шэраг іншых.

Адзін толькі гэты зусім не поўны пералік паказвае, наколькі шырокім колам пытанняў даводзіцца займацца парламентарыям і якімі тэмпамі развіваецца і ўдасканальваецца заканадаўчая база нашай краіны.

Асобна хачу спыніцца на Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый». Гэты дакумент вельмі неабходны ў цяперашніх сучасных умовах. Настаў час, калі трэба ўсім — і кіраўнікам, і работнікам — максімальна адказна падысці да сваіх абавязкаў, з тым каб забяспечыць эфектыўную работу ўсіх нашых арганізацый і прадпрыемстваў незалежна ад формы ўласнасці. Толькі пры гэтай умове мы зможам захаваць суверэнітэт і гарантаваць устойлівае развіццё нашай краіны.

Акрамя сесійных заданняў, нашы сенатары актыўна працавалі над законапраектамі ў фармаце парламенцкіх слуханняў, сумесных пасяджэнняў пастаянных камісій абедзвюх палат, семінараў, круглых сталоў з шырокім удзелам спецыялістаў і грамадскасці. Цалкам апраўдала сябе такая форма работы, як навукова-кансультатыўныя саветы. Іх у нас створана два: адзін — па пытаннях развіцця эканомікі і другі — па пытаннях сацыяльнай сферы. Па сутнасці, гэта новыя, вельмі эфектыўныя парламенцкія пляцоўкі для абмеркавання і ўсебаковага аналізу вельмі важнай для краіны праблематыкі.

У бягучым годзе Прэзідыум Савета Рэспублікі разам з работнікамі Сакратарыята ўпершыню правёў работу па маніторынгу практыкі прымянення некаторых законаў. Атрыманы вопыт паказаў, што гэта вельмі карысны напрамак нашай дзейнасці. Ён дае магчымасць не толькі аператыўна рэагаваць на праблемныя пытанні, але і выпрацаваць шэраг рэкамендацый па іх далейшым удасканаленні.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Адной з найважнейшых задач нашага парламента з'яўляецца пашырэнне і абарона нацыянальных інтарэсаў краіны на міжнароднай арэне. Асаблівую ўвагу тут неабходна ўдзяляць пытанням пашырэння рынкаў збыту айчынных тавараў за мяжой, прыцягненню інвестыцый у нашу краіну і ўмацаванню іміджу Беларусі ў свеце.

У сувязі з гэтым я хачу адзначыць, што, дзякуючы актыўнай рабоце членаў Савета Рэспублікі, у гэтай сферы дасягнуты пэўныя станоўчыя вынікі.

Новы змест атрымала супрацоўніцтва нашага Савета Рэспублікі з Саветам Федэрацыі расійскага парламента, аб чым сведчыць паспяховае правядзенне першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Пашырана геаграфія кантактаў у Азіі і Лацінскай Амерыцы, на якасна новы ўзровень выйшла двухбаковае ўзаемадзеянне з заканадаўчымі органамі Турцыі, Шры-Ланкі, Лаоса.

У прыватнасці, у кастрычніку адбыўся афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь у Турэцкую Рэспубліку, які стаў важным крокам на шляху далейшага ўмацавання міждзяржаўнага партнёрства дзвюх краін. Прымаючы нашу парламенцкую дэлегацыю, Прэзідэнт Турэцкай Рэспублікі Рэджэп Таіп Эрдаган афіцыйна заявіў, што разглядае Беларусь як асноўнага партнёра на паўночным напрамку.

У час сустрэч са старшынёй Вялікага нацыянальнага сходу Турэцкай Рэспублікі Джэмілем Чычэкам, кіраўнікамі горада і правінцыі Стамбул былі дасягнуты дамоўленасці аб пашырэнні міжрэгіянальных сувязяў і развіцці шэрагу перспектыўных для супрацоўніцтва напрамкаў.

У лістападзе адбыўся першы афіцыйны візіт парламенцкай дэлегацыі нашай краіны ў Шры-Ланку. Гэты візіт даў магчымасць не толькі вызначыць асноўныя напрамкі міжпарламенцкага супрацоўніцтва і парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, на якіх беларускі бок выступіў з шэрагам прапаноў наконт пераадолення некаторых праблем сучаснага свету.

Традыцыйна вялікая ўвага была ўдзелена міжпарламенцкім адносінам з Расійскай Федэрацыяй. Адным з асноўных мерапрыемстваў у гэты перыяд стала сорак сёмая сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, на якой быў прыняты бюджэт Саюзнай дзяржавы на наступны год.

Члены Савета Рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у дзейнасці Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Трэба таксама адзначыць работу членаў Савета Рэспублікі ў міжнародных місіях па назіранні за выбарамі народных дэпутатаў Украіны і дэпутатаў парламента Рэспублікі Малдова.

Паважаныя калегі! Хачу адзначыць, што нашы сенатары на працягу разглядаемага перыяду актыўна працавалі таксама і ў рэгіёнах. Шэраг з іх прынялі ўдзел у сесіях Саветаў дэпутатаў і пасяджэннях выканкамаў у абласцях, раёнах і гарадах рэспублікі, ажыццяўлялі прыём грамадзян і ўдзельнічалі ў разглядзе іх зваротаў.

Хачу вас праінфармаваць, што ў справаздачны перыяд у Савет Рэспублікі паступіла 2186 зваротаў, у тым ліку 1815 электронных. Усе яны былі разгледжаны, і на ўсе былі дадзены адказы. Як паказвае практыка, электронная форма зваротаў становіцца ўсё больш папулярнай. Яна рэзка пашырае магчымасці для грамадзян выказаць свае меркаванні, звярнуцца са скаргамі або ўнесці прапановы па тых ці іншых пытаннях. Вядома, гэта істотна павышае нагрузку на членаў Савета Рэспублікі і работнікаў сакратарыята, але разам з тым дае магчымасць нам даволі аператыўна атрымліваць інфармацыю аб адносінах грамадзян да прымаемых законаў і выяўляць вузкія месцы ў нашым заканадаўстве.

Як заўсёды, вялікую ўвагу сенатары ўдзялялі ўзаемадзеянню са СМІ. У перыяд асенняй сесіі наша дзейнасць знайшла адлюстраванне ў 150 матэрыялах электронных і друкавых сродкаў масавай інфармацыі. Члены Савета Рэспублікі выступалі як з тлумачэннямі па нядаўна прынятых законах, так і па многіх іншых пытаннях, якія ўяўляюць інтарэс для нашага насельніцтва.

У сувязі з гэтым я хачу выказаць удзячнасць журналістам, акрэдытаваным у Савеце Рэспублікі, за аб'ектыўнае і аператыўнае асвятленне нашай работы.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

2015 год для ўсіх нас асаблівы, паколькі ў гэтым годзе адбудуцца выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Трэба мець на ўвазе, што не толькі кіраўнік дзяржавы, але і ўсе мы будзем трымаць справаздачу перад выбаршчыкамі аб праведзенай рабоце. Таму наша задача — прыняць самы актыўны ўдзел у мерапрыемствах, звязаных з правядзеннем перадвыбарнай прэзідэнцкай кампаніі, і давесці да кожнага выбаршчыка тую дзяржаўную палітыку, якую ў імя ўмацавання і працвітання краіны праводзіць наш Прэзідэнт. Трэба гаварыць з людзьмі сумленна, адкрыта, зразумелай мовай. Умець пераканаўча паказаць на фактах і прыкладах, як змянілася і якіх каласальных вынікаў дасягнула Беларусь за апошнія дваццаць гадоў.

Наш народ разумны, ён усё ацэніць і зробіць правільны выбар. У гэтым няма ніякіх сумненняў.

Дарагія сябры!

У наступным годзе па ўсёй рэспубліцы пройдуць памятныя мерапрыемствы і ўрачыстасці, прысвечаныя 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Акрамя таго, кіраўніком дзяржавы 2015 год аб'яўлены ў нашай краіне Годам моладзі. Важна, каб работа па гэтых двух напрамках была ўзаемаўвязана і накіравана на патрыятычнае выхаванне моладзі. Гэта асабліва актуальна ў цяперашні час, калі ў свеце робяцца спробы перапісаць гісторыю, абяліць паслядоўнікаў фашызму, прынізіць подзвіг нашага народа, які цаной вельмі вялікіх ахвяр адстаяў свабоду і незалежнасць Радзімы, выратаваў ад карычневай чумы краіны Еўропы. Наша моладзь павінна ведаць праўду пра вайну, ганарыцца подзвігам свайго народа і аказваць шэфскую дапамогу ветэранам.

Паважаныя калегі!

Набліжаецца Новы год. Карыстаючыся магчымасцю, хачу нагадаць, што цяпер у нашай краіне праводзіцца дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». Прашу вас знайсці час і наведаць школы, дзіцячы дамы, інтэрнаты і павіншаваць хлопчыкаў і дзяўчынак з навагоднімі святамі.

На заканчэнне дазвольце падзякаваць вам за сумесную плённую работу, павіншаваць з надыходзячымі Калядамі і Новым годам, пажадаць вам і вашым блізкім здароўя, дабрабыту, міру, ажыццяўлення вашых планаў і жаданняў!

Дзякуй за ўвагу.

АДСТОЙВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Бюджэт, а таксама змяненні, унесеныя ў Падатковы кодэкс, улічваюць інтарэсы айчынных вытворцаў, прадугледжваюць паступовы адыход ад практыкі перакрыжаванага субсідзіравання, стваральчы тым самым умовы для зніжэння сабекошту прадукцыі, павышэння яе канкурэнтаздольнасці.

Гэта асабліва актуальна ў сувязі з уступленнем у сілу Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, які ратыфікаваны ў ходзе сесіі. Безумоўна, стварэнне агульнага рынку адкрывае дадатковыя магчымасці, і мы проста абавязаны імі правільна распарадзіцца.

У той жа час асноўныя мэты саюза могуць быць дасягнуты толькі пры ўмове строгага выканання прынцыпаў раўнапраўя і ўліку нацыянальных інтарэсаў бакоў, адмовы ад усялякіх выключэнняў і абмежаванняў.

Праблемы з транзітам і пастаўкамі беларускай прадукцыі на расійскі рынак не садзейнічаюць умацаванню саюзніцкіх адносін і пашырэнню ідэй еўразійскай інтэграцыі.

Нам неабходна больш актыўна адстойваць свае інтарэсы, асвойваць новыя рынкі, працаваць над якасцю прадукцыі, прымаць меры па ўмацаванні эканомікі, робячы яе менш успрымальнай для знешняга ўздзеяння.

Работа наперадзе вялікая. Ужо сёння практычна ўсе законапраекты эканамічнага блока разглядаюцца намі ў такім ключы. Гэта, у прыватнасці, датычыцца прынятых на бягучай сесіі законаў «Аб рынку каштоўных папер» і «Аб энергазбяражэнні», паправак у Закон «Аб гарантаваным кампенсаванні банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асоб».

Самую пільную ўвагу дэпутаты ўдзялілі развіццю аграпрамысловага комплексу, удасканаленню сістэмы кантролю якасці і бяспекі сельскагаспадарчай прадукцыі. Па-новаму ўрэгуляваны пытанні ветэрынарнай дзейнасці. Зроблены першы крок у напрамку стварэння сістэмы ідэнтыфікацыі, рэгістрацыі, прасочвальнасці сельскагаспадарчых жывёл і прадуктаў жывёльнага паходжання.

Перспектывы росту эканомікі, паспяховай рэалізацыі інфраструктурных праектаў у сацыяльнай сферы ўвязваюцца з выкарыстаннем магчымасцяў прыватнага капіталу. Гэтай тэме былі прысвечаны парламенцкія слуханні, вынікам якіх стала выпрацоўка падыходаў да рэалізацыі механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Важныя прававыя рашэнні прыняты і ў сацыяльнай сферы. Магчымасць замены воінскай службы на альтэрнатыўную, далейшае развіццё фізкультуры і спорту, удасканаленне лекавага забеспячэння насельніцтва, донарства — гэта далёка не поўны пералік значных для насельніцтва пытанняў, якія з асаблівай увагай былі разгледжаны дэпутацкім корпусам.

Задача забеспячэння дзяржаўнага суверэнітэту ў сучасных умовах запатрабавала разгляду важкага пакета дакументаў у сферах нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку.

Сёння ў барацьбе за геапалітычнае панаванне ўсё актыўней выкарыстоўваецца практыка распальвання міжнацыянальнай і міжрэлігійнай варожасці, насаджэння экстрэмізму, развязвання інфармацыйных войнаў.

Крызіс ва Украіне стаў сур'ёзным выклікам для ўсёй сусветнай супольнасці. Увесь гэты час мы з трывогай сочым за развіццём сітуацыі ў гэтай брацкай для нас краіне. Сваю пазіцыю беларускія парламентарыі не раз выказвалі на розных узроўнях і пляцоўках, уключаючы Парламенцкую асамблею АБСЕ і Міжпарламенцкі саюз.

Беларусь з самага пачатку заклікала ўсе бакі канфлікту адмовіцца ад насілля, шукаць шляхі вырашэння супярэчнасцяў выключна мірнымі сродкамі і за сталом перагавораў.

Разам з тым з гэтай сітуацыі наша дзяржава атрымала адпаведныя ўрокі. Прынятыя на сесіі заканадаўчыя рашэнні прызначаны павысіць абараназдольнасць краіны, надзейнасць дзяржаўных граніц, наладзіць дзейсныя механізмы абароны інфармацыі. Канцэптуальна новыя рашэнні прыняты ў сферах крымінальнага, адміністрацыйнага і працэсуальнага заканадаўства. Узмоцнены меры па барацьбе з карупцыяй, экстрэмізмам, наркаманіяй, гандлем людзьмі. Прадаўжаецца работа па ўдасканаленні механізмаў разгляду зваротаў грамадзян, недапушчэнні фармалізму і абыякавага стаўлення да праблем насельніцтва.

Міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў накіравана на ўмацаванне пазіцый беларускай дзяржавы на ўсіх вектарах яе знешняй палітыкі.

Значна пашырылася міжнародна-дагаворная база Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчае забеспячэнне атрымала развіццё супрацоўніцтва з Бразіліяй, Грэцыяй, Ізраілем, Камбоджай, Кітаем, Расіяй, Эквадорам, іншымі краінамі.

Асаблівы акцэнт рабіўся на пашырэнне эканамічных інтарэсаў краіны. У гэтым плане паказальныя вынікі афіцыйнага візіту беларускай дэлегацыі ў Шры-Ланку, дзе нараўне з парламенцкім складнікам вялікая ўвага ўдзялялася абмеркаванню пытанняў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У ходзе візіту падпісаны Мемарандум паміж Беларускай гандлёва-прамысловай палатай і Цэйлонскай гандлёвай палатай. Дасягнуты дамоўленасці аб стварэнні ў Шры-Ланцы сумеснага прадпрыемства па зборцы трактароў «Беларус». У перспектыве — рэалізацыя іншых кааперацыйных праектаў, уключаючы вытворчасць малочнай прадукцыі, зборку аўтобусаў і грузавікоў МАЗ, падрыхтоўку ланкійскіх спецыялістаў у беларускіх ВНУ.

Прынцыпова важна, што ў перыяд сесіі актывізаваўся парламенцкі дыялог з еўрапейскімі дзяржавамі. Праведзены сустрэчы з парламентарыямі Аўстрыі, Латвіі, Польшчы, Францыі, Швейцарыі. Адбыўся рабочы візіт парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Чэхію. Вынікі перагавораў з чэшскімі парламентарыямі і прадстаўнікамі дзелавых колаў пацвярджаюць узаемную зацікаўленасць у паглыбленні ўзаемадзеяння ў розных сферах, у тым ліку і на міжнароднай арэне. Такія кантакты з еўрапейскімі парламентарыямі трэба развіваць, дабіваючыся ўстанаўлення трывалага і адкрытага дыялогу як на міжпарламенцкім, так і на міждзяржаўным узроўнях.

Канструктыўна вялася работа і ў рамках інтэграцыйных структур на постсавецкай прасторы. У ходзе 47-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі разгледжана шырокае кола пытанняў, галоўным з якіх стала прыняцце бюджэту Саюзнай дзяржавы, што прадугледжвае фінансаванне 36 сумесных праграм і мерапрыемстваў.

Пляцоўка саюзнага парламента была выкарыстана і для абмеркавання актуальных пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва. Праведзены дыялог паказаў, што для парламентарыяў не існуе закрытых тэм, і нам трэба актыўней выкарыстоўваць парламенцкую дыпламатыю для вырашэння ўзнікаючых праблем.

Плённай была работа дэпутатаў у міжпарламенцкіх асамблеях СНД і ЕўрАзЭС, Парламенцкай Асамблеі АДКБ, прававая база якіх папоўнілася больш як 20 мадэльнымі заканадаўчымі актамі і рэкамендацыямі.

Сярод мерапрыемстваў, праведзеных па лініі гэтых інтэграцыйных структур у нашай краіне, адзначу міжнародную канферэнцыю «Выбарчыя працэсы на прасторы СНД», выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі ПА АДКБ па пытаннях абароны і бяспекі, прысвечанае вывучэнню ваенна-палітычнай абстаноўкі ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі АДКБ.

У адпаведнасці з рашэннем, прынятым Міждзяржаўным Саветам Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Міжпарламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС завяршае сваю дзейнасць. У сувязі з гэтым хачу падзякаваць дэпутатам, якія прымалі актыўны ўдзел у рабоце гэтай арганізацыі. Упэўнены, яе вопыт будзе запатрабаваны і адыграе важную ролю ў развіцці еўразійскай інтэграцыі.

Паважаныя калегі!

Напружаная дзейнасць прадоўжыцца і ў жнівеснія месяцы. Напаўненне парадку дня вясенняй сесіі, па сутнасці, пачалося ўжо. Фарміруецца даволі інтэнсіўная міжнародная праграма. Вялікі аб'ём работы трэба будзе выканаць і ў выбарчых акругах.

У перыяд навагодніх свят у краіне праходзіць рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». І, вядома, дэпутатам трэба прыняць у ёй самы актыўны ўдзел. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць вывучэнню сітуацыі ў акругах, паглядзець, ці ўсё робіцца мясцовымі органамі ўлады для вырашэння праблем, якія хвалююць насельніцтва, ацаніць эфектыўнасць работы са зваротамі грамадзян.

Трэба часцей сустракацца з людзьмі, абмяркоўваць прынцыповыя пытанні жыцця грамадства і дзяржавы, ісці ў працоўныя калектывы, асабліва маладзёжныя, у студэнцкія аўдыторыі, сустракацца з маладзёжным актывам. Наступны год аб'яўлены кіраўніком дзяржавы Годам моладзі. І гэта невыпадкова: галоўны здабытак Беларусі — чалавечы патэнцыял. Краіне патрэбны энергічныя, ініцыятыўныя, прадпрымальныя людзі, для якіх любоў да Радзімы — не пусты гук.

Сёння ад кожнага патрабуецца быць гатовым узяць на сябе максімальную адказнасць — за свой лёс, лёс сваёй сям'і, лёс сваёй краіны. З'яднаць грамадства вакол гэтай ідэі, забяспечыць яго кансалідацыю — наш прамы абавязак.

На заканчэнне, паважаныя калегі, хачу падзякаваць вам за праведзеную работу і сардэчна павіншаваць усіх прысутных з надыходзячымі навагоднімі і каляднымі святамі. Новы год — гэта самае любімае ў народзе, самае дамашняе і сямейнае свята. З ім мы звязваем добрыя надзеі і чаканні. Кожнаму хочацца верыць, што ў жыцці яго чакаюць перамены да лепшага і абавязкова збудуцца самыя запаветныя мары.

Шчыра жадаю моцнага здароўя, аптымізму, здзяйснення задуманага вам і вашым блізкім, дабрабыту і працвітання нашаму агульнаму дому — роднай Беларусі.

Валютным махінацыям «падрэзалі крылы»

ВАЛЮТЫ ХОПІЦЬ УСІМ

Так, Тарас Надольны адзначыў, што ў апошнія дні ў краіне назіраўся недахоп наяўнай замежнай валюты. Пры такім ажыятажным попыце на яе з боку насельніцтва гэта і не дзіўна, бо ў нас замежныя банкноты доларaў і еўра не друкуюць. Прадстаўнік Нацбанка паведаміў, што цяпер галоўны рэгулятар гэтыя пытанні вырашае аператыўна. Валюта заказана ў замежных банках. Таму ў бліжэйшыя дні ў абменных пунктах яна будзе ў дастатковай колькасці. «Як гаворыцца, самалёты ўжо на падлёце», — сказаў першы намеснік кіраўніка Нацбанка.

БОЛЬШ ПАВАЖАЦЬ СВАЕ ГРОШЫ

Адначасова становяцца больш жорсткімі падыходы да правядзення грашова-крэдытнай палітыкі для абмежавання росту грашовай масы і павелічэння «кошту» грошай.

У прыватнасці, банкам рэкамендавана не дапускаць да 1 лютага наступнага года павелічэння крэдытнага партфеля ў беларускіх рублях і не ажыццяўляць змяненне валюты грашовых абавязацельстваў пазычальнікаў па крэдытных дагаворах.

Адначасова прынята рашэнне аб непрымяненні да банкаў мер нагляднага рэагавання за невыкананне з 18 снежня сёлета да 1 студзеня 2015 года патрабаванняў пастановы Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі ад 22 красавіка 2014 года № 260 «Аб максімальным памеры працэнтных ставак па аперацыях банкаў па прадастаўленні грашовых сродкаў (крэдытаў) юрыдычным асобам — рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прынятыя меры дадуць магчымасць павысіць прывабнасць зберажэнняў у беларускіх рублях, збалансаваць валютны рынак ва ўмовах павышанага попыту на замежную валюту і не дапусціць росту спекулятыўных настрояў.

З мэтай канцэнтрацыі ўсіх валютных патокаў сёння прапануецца ажыццяўляць кансалідацыю здзелак на біржавым рынку. Таму пакуль часова — папярэдне да 1 лютага 2015 года — мяркуецца прыпыніць правядзенне аперацый на пазабіржавым рынку, паведаміў намеснік кіраўніка Нацбанка. Ён звярнуў увагу на тое, што гэта падтрымліваецца рашэннем Нацбанка аб павелічэнні з 19 снежня для суб'ектаў гаспадарання — рэзідэнтаў Беларусі — нормы абавязковага продажу валютнай выручкі, якая паступае ў краіну, да 50%.

Тарас Надольны запэўніў, што ўсе меры, якія прымаюцца рэгулятарам і ўрадам, змогуць дазволіць у досыць хуткай перспектыве стабілізаваць напружанасць, збалансаваць попыт на валютным рынку з прапановай валюты, захаваць золатавалютныя рэзервы і не дапусціць росту спекулятыўных настрояў, якія пачынаюць праяўляцца.

АБВАЛУ РУБЛЯ НЕ БУДЗЕ — БО НЯМА ПАДСТАЎ

Беларускі рубель не трапіць у такое ж становішча, як расійскі, запэўніў журналістаў Аляксандр Забароўскі. Чыноўнік упэўнены, што ўрадам і Нацбанкам краіны прыняты самыя рашучыя меры на валютным рынку, каб усе яго ўдзельнікі ясна разумелі, што спаду курсу беларускага рубля ў піке пад уздзеяннем ажыятажнага попыту дапушчана не будзе. «Мы разумеем, што ажыятажны попыт на валюту справакаваны чаканнямі з-за рэзкага падзення курсу ў нашага асноўнага гандлёвага партнёра. А раўнаважны курс расійскага рубля да гэтага часу не вызначаны. І за ім у гэтую нявызначанасць беларускі рубель не пойдзе», — адзначыў Аляксандр Забароўскі.

Ён падкрэсліў, што рашэнні ў галіне валютнай палітыкі прыняты і рэалізуюцца выключна рынкавымі інструментамі. Валютны рынак, як і любы іншы, падпарадкоўваецца законам попыту і прапановы. Таму палітыка рэгулятара і ўрада — рэзка знізіць попыт на валюту і павялічыць яе прапанову, лічыць Аляксандр Забароўскі.

Больш за тое, нейкага эканамічнага абгрунтавання валютнага ажыятажу сёння не існуе, лічыць спецыяліст. Дэфіцыт плацежнага балансу Беларусі зніжаны сёлета на 2 млрд доларaў. Грашова-крэдытная і бюджэтна-падатковая палітыкі дзяржавы, а таксама структурныя меры даюць магчымасць забяспечыць рэнтабельнасць, эфектыўнасць і стабільнасць на беларускім валютным рынку, упэўнены прадстаўнік урада.

Паводле яго слоў, налета з 1 студзеня ў нашу краіну ў поўным аб'ёме пачнуць паступаць усе вывазныя мытныя пошліны ад экспарту нафты і нафтапрадуктаў, знізіцца кошт прыроднага газу, імпартнай сыравіны і матэрыялаў. Ва ўрадзе ўпэўнены, што гэта акажа сур'ёзнае станоўчае ўздзеянне на плацежны баланс краіны. Аляксандр Забароўскі адзначыў, што развіццё эканомікі Беларусі не будзе спынена, а працоўныя калектывы і прадпрыемствы будуць падтрыманы. Урад і Нацыянальны банк забяспечаць маніторынг становішча на валютным рынку і прымуць вычарпальныя меры для забеспячэння яго стабільнасці.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛІЧБАВАЕ РАДЫЁ — БЛІЗКАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ?

Наша краіна павінна ўлічваць сусветныя тэндэнцыі ў радыёвяшчанні

Пра гэта заявіў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў падчас рэспубліканскай нарады аб развіцці радыёвяшчання, паведамляе БЕЛТА.

У цэнтры ўвагі на нарадзе было пытанне праваднога радыё. Так, год таму радыёвяшчанне рэспублікі пачало працу ў новых рэаліях — РУП «Белтэлекам» прыступіла да адключэння правадной сеткі. Аляксандр Радзькоў адзначыў, што Беларусі неабходна глыбей знаёміцца з сусветным вопытам у гэтай сферы. Ён прывёў вопыт Таджыкістана, які адключыў правадное радыё ўжо пяць гадоў таму, а Беларусь прыйшла да гэтага толькі нядаўна.

У ходзе калегіі Аляксандр Радзькоў звярнуўся да першага намесніка міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрыя Шэдко з пытаннем пра тое, да чаго ў прынцыпе можа імкнуцца радыё ва ўсім свеце ў цэлым і беларускае — у прыватнасці. На думку Дзмітрыя Шэдко, адзін з кірункаў развіцця — лічбавае радыё (па аналогіі з лічбавым тэлебачаннем). «Думаю, на працягу некалькіх гадоў мы ўбачым у свеце паспяховыя праекты лічбавага радыё, што значна знізіць нагрузку на радыёчастотны рэсурс», — перакананы Дзмітрый Шэдко.

#

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 11 (40)

■ З першых вуснаў

«Наша задача — забяспечыць бясхмарнае неба, абараніць паветраныя межы»

Алег ДВІГАЛЕЎ:

Новы навучальны год пачаўся ва Узброеных Сілах Беларусі. Традыцыйна ў першы зімні дзень у злучэннях і воінскіх часцях прайшлі ўрачыстыя пастраенні і мітынгі. А напярэдадні падвялі вынікі мінулага года, агучылі планы на будучы, які аб'яўлены годам сумеснай падрыхтоўкі ўзброеных сіл Беларусі і Расіі.

Падчас асабістай сустрэчы з журналістамі **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны генерал-маёр Алег ДВІГАЛЕЎ** расказаў пра асноўныя дасягненні мінулага года ў гэтым відзе Узброеных Сіл, абазначыў некаторыя напрамкі і перспектывы развіцця, запэўніў у бяспецы паветраных рубяжоў краіны. Пра гэта і іншае — з першых вуснаў.

Алег ДВІГАЛЕЎ.

АБ ПРАВЕРЦЫ ЧЭМПІЯНАТАМ І ПАРАДЗЕ ПАВЕТРАНЫХ ЭШАЛОНАЎ

«Мінулы вучэбны год мы правялі на высокім узроўні. Увесь асабовы склад Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны праявіў высокую арганізаванасць і мэтанакіраванасць, паказаў разуменне таго, што менавіта ад нас залежыць, наколькі чыстым будзе наша неба, наколькі ўпэўнена будуць жыць нашы грамадзяне.

Пачынаючы з лютага, мы падвяргаліся праверцы па плане кіраўніка дзяржавы — і на абодвух этапах паказалі добрыя вынікі. Вядома, былі і недахопы. Затое мы бачым, над чым яшчэ трэба працаваць, на што звярнуць асаблівую ўвагу.

У практычную рэалізацыю ўжо ўвайшоў дагавор аб пастаўцы ў рэспубліку чатырох вучэбна-баявых самалётаў Як-130.

Сёлета мы адказвалі за бяспеку пры правядзенні чэмпіянату свету па хакеі. У першую чаргу, гэта тычылася паветранай прасторы. Пастаўленыя задачы выконвалі разам з экіпажамі Расійскай Федэрацыі. У канцы 2013 года было арганізавана сумеснае баявое дзяжурства на аэрадроме Баранавічы, і авіяцыйны складнік дзвюх краін, а ў цэлым Саюзнай дзяржавы, рабіў усё дзеля таго, каб мерапрыемства прайшло спакойна, а народ атрымліваў асалоду ад спартыўных вынікаў.

Актыўна бралі ўдзел і ў парадзе, прысвечаным 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паказ авіяцыйнай тэхнікі прайшоў з удзелам расійскіх паветраных эшалонаў. У выніку была прадэманстравана высокая зладжанасць экіпажаў. У ходзе падрыхтоўкі да парада мы нечаму вучыліся ў нашых калег, а яны, у сваю чаргу, дзяліліся вопытам пры выкананні палётаў, што мела станоўчыя вынікі ў цэлым для падрыхтоўкі нашых войскаў.

Вялікі аб'ём задач выконваны сіламі зенітных ракетных войскаў. Гэты год як ніколі выніковы менавіта для гэтага роду войскаў. Практычна былі ажыццёўлены баявыя стрэльбы на расійскіх палігонах Ашулук і Тэлемба, на нашым палігоне Даманава. Упершыню на тэрыторыі Беларусі трэцяя батарэя зенітнага ракетнага комплексу «Тор» выканала баявыя пускі, і ўсе чатыры машыны, выведзеныя на палігон, паказалі добрыя вынікі. Традыцыйна на стрэльбах былі задзейнічаны і разлікі, створаныя з курсантаў Ваеннай акадэміі Беларусі. Можна смела казаць, што выпускнікі наступнага года ўжо амаль падрыхтаваны».

ПРА ПАРУШЭННІ ПАВЕТРАНАЙ ПРАСТОРЫ, ПРАВЕРКУ ТЭХНІКІ І ЎЗБРАЕННЯ

«Нельга не сказаць і пра радыётэхнічныя войскі — тых, каго называюць вачамі і вушамі Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. Мы, магчыма, не бачым практычных вынікаў. Дзесьці ў лесе або на горцы стаіць комплекс, круціцца антэна, і многія не разумеюць, для чаго ўсё патрэбна. У гэты час разлікі радыётэхнічных войскаў нясуць баявое дзяжурства. Кожны дзень каля 400 чалавек назірае за тым, каб паветраная прастора краіны не была парушана. Аднак некаторыя ўмяшанні, ўсё ж такі ўзнікаюць. Мы адзначалі, у тым ліку ў цесным узаемадзеянні з нашымі пагранічнікамі, парушэнні дзяржаўнай мяжы. Назіралася і парушэнне парадку выкарыстання паветранай прасторы ўнутры тэрыторыі. Звязаны яны з тым, што сёння паветраныя апараты даступныя для нашых грамадзян, у якіх узнікае жаданне падняцца ў неба, і гэта нармальна. Аднак некаторыя забываюць, што, як і на дарогах, ёсць правілы руху ў паветранай прасторы. Іх трэба выконваць.

Мы ажыццявілі задачу, пастаўленую міністрам абароны, па праверцы тэхнікі і ўзбраення. У Савецкім Саюзе распрацоўваліся такія ўзоры ўзбраення, якія і цяпер рэалізуюць і забяспечваюць выкананне задач. І тыя прыклады, якія мы назіраем у нашага паўднёвага суседа, паказваюць, што неабходна вельмі бераўліва ставіцца да ўтрымання тэхнікі і ўзбраення. Праверка, якая праводзілася падчас навучальнага года (а мы праверылі больш чым 7 тысяч узораў тэхнікі і ўзбраення), дае магчымасць з упэўненасцю сказаць, што часці і падраздзяленні Ваенна-паветраных сіл і супрацьпаветранай абароны могуць якасна выканаць пастаўленыя задачы ў поўным аб'ёме. Няспраўнай тэхнікі засталося менш чым 5%. У цэлым, шэраг мерапрыемстваў дазволіў нам прыйсці да добрага стану баявой гатоўнасці».

ПРА СУМЕСНЫЯ БАЯВЫЯ ДЗЯЖУРСТВЫ І ЗАКУПКУ НОВАЙ ЗБРОІ

«У снежні разам з расійскімі калегамі мы будзем адзначаць год сумеснага баявога дзяжурства на аэрадроме Баранавічы. Гэта тое мерапрыемства ў межах узаемадзеяння, якое рэалізуецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Штомесячна тут адбываюцца ратацыі авіяцыйнай тэхнікі, і расійскія лётчыкі разам з нашымі нясуць баявое дзяжурства. Сёлета эканажамі Беларусі і Расіі было выканана больш чым 400 сумесных вылетаў. Нашы калегі таксама дапамагалі нам падчас чэмпіянату свету па хакеі.

Тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны.

Кожны дзень каля 400 чалавек назірае за тым, каб паветраная прастора краіны не была парушана.

Сёння на аэрадроме ў Баранавічах нясуць баявое дзяжурства 4 самалёты Су-27. І пакуль нам гэтага дастаткова. У практычную рэалізацыю ўжо ўвайшоў дагавор аб пастаўцы ў рэспубліку чатырох вучэбна-баявых самалётаў Як-130. Ужо ў студзені мы адпраўляем у Расійскую Федэрацыю лётчыкаў і тэхнікаў для навучання. Пасля іх падрыхтоўкі мы атрымаем самалёты і ажыццявім пералёт на аэрадром Ліда, пасля чаго будзем асвойваць тэхніку на тэрыторыі нашай краіны.

У радыётэхнічныя войскі працягваецца закупка новых станцый выяўлення малавышынных цэляў «Раса». Таксама плануецца пастаўка некалькіх комплексаў «Усход» і «Радар», якія распрацоўваюцца на беларускіх прадпрыемствах. Акрамя таго, мы ідзём па шляху мадэрнізацыі. Новы ўзор каштуе вялікіх грошай, таму мадэрнізацыя і капітальны рамонт вырашае гэтую праблему».

ПРА БУДУЧЫЯ ВУЧЭННІ І СВЯТКАВАННЕ 70-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

«2014/2015 навучальны год, напэўна, не будзе лёгкім для Узброеных Сіл. Чакаецца шэраг мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі. Перш за ўсё, гэта сумесныя вучэнні з Расійскай Федэрацыяй «Шчыт Саюза — 2015», якія пройдуць на тэрыторыі Расіі. Таксама разлікі Ваенна-паветраных сіл і супрацьпаветранай абароны возьмуць удзел у вучэннях аб'яднанай сістэмы СНД «Баявая Садружнасць — 2015». Асаблівасць гэтых вучэнняў, якія праходзяць раз на два гады, — у тым, што мы адсвяткуем 20-годдзе аб'яднанай сістэмы супрацьпаветранай абароны. Таму будзем павінны пацвердзіць, як неаднойчы рабілі, што аб'яднаная сістэма супрацьпаветранай абароны мае самыя высокія вынікі ў арганізацыі ўзаемадзеяння на постсавецкай прасторы.

Таксама мы рыхтуемся да правядзення вучэнняў з нашымі злучэннямі і воінскімі часцямі, у тым ліку паказальных. Задача — навучыць асабовы склад. Не сакрэт, што пастаянна адбываецца абнаўленне, прыходзяць маладыя афіцэры. І ад таго, наколькі якасна мы іх падрыхтуем на пачатковым этапе, залежыць далейшае выкананне задач гэтымі афіцэрамі.

Мы будзем прымаць удзел і ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У Міністэрстве абароны яны запланаваны не толькі на 9 мая 2015 года, а і ў тыя дні, якія будуць папярэднічаць гэтай падзеі. Натуральна, што мы рыхтуемся і да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. І, як заўсёды, наша задача — забяспечыць бясхмарнае неба, абараніць паветраныя межы.

І сёння насельніцтва Беларусі можа быць упэўнена ў тым, што Узброеныя Сілы годна забяспечваюць бяспеку, тэрытарыяльную цэласнасць, суверэнітэт і незалежнасць нашай дзяржавы. Мы рэгулярна праводзім аналіз тых падзей, якія адбываюцца ў нашых паўднёвых суседзяў. І тая праверка тэхнікі і ўзбраення, якая пачалася да канфлікту ва Украіне, дазваляе з упэўненасцю сказаць, што калі спатрэбіцца, то задача будзе выканана. Мы ў любы момант гатовыя даць адпор усім неразумным, хто паспрабуе дэстабілізаваць становішча ў краіне».

Вераніка КАНЮТА.
Фота з архіва Міністэрства абароны

■ Памяць

ІМЕМ ФРАНТАВІКА І НАВУКОЎЦЫ

Медыятэцы Інстытута журналістыкі БДУ прысвоілі імя прафесара Міхаіла Цікоцкага. Урачыстае мерапрыемства адбылося ў дні святкавання 70-годдзя галоўнай кузні журналісцкіх кадраў краіны.

У медыятэцы прадстаўлена звыш 120 навуковых прац, артыкулаў і кніг заснавальніка школы беларускай стылістыкі. На адной з паліц узвышаецца «Кніга памяці прафесара Міхаіла Цікоцкага». Усе ахвотныя могуць пакінуць тут свае ўспаміны аб выдатным беларускім вучоным і журналісце. Пра яго нагадваюць некаторыя асабістыя рэчы прафесара: яго малюнкі, фартэпіяна, на якім любіў іграць сын славутага кампазітара, нават выразкі публікацый у «Звяздзе», дзе рэгулярна друкаваўся.

Тут і ваенныя ўзнагароды: два медалі «За адвагу» і ордэн Айчыннай вайны I ступені. У Вялікую Айчынную лёс звязаў Міхаіла Яўгенавіча з партызанамі. Ды яшчэ дзе! У Любанскім раёне, на востраве Зыслаў, дзе выходзіла падпольная «Звязда». Затым ваяваў на 1-м, 2-м і 3-м Беларускіх франтах. Дайшоў да Кёнігсберга, быў паранены.

...Міхаіла Цікоцкага не стала ў сакавіку 2012 года. Толькі памяць аб ім жыве. І будзе яшчэ доўга жыць: у сценах медыятэкі журфака БДУ — дакладна.

Вераніка КАНЮТА

■ Справы вайсковыя

ЯК СТАНОВЯЦЦА САЛДАТАМІ

Лістападаўскія прызыўнікі — ужо ў вайсковых часцях. Яшчэ ўчора маладыя хлопцы былі ў віры цывільнага жыцця. А сёння — новенькі, халаднавата-нязграбны камуфляж, нязвыклы і вельмі афіцыйны зварот «таварыш салдат» ды строгі старшына, які цяпер пачаткоўцам замест таты і мамы. І толькі стракатая куча куртак, кашуль і джынсаў, складзеных у капцёрцы, нагадваюць пра дзень учарашні...

У 72-і гвардзейскі аб'яднаны вучэбны цэнтр прыбылі каля трохсот навабранцаў. І да канца армейскіх будняў усе яны застануцца служыць у сталым саставе армейскай «вучэбкі». Гэта будучыя малодшыя камандзіры, вадзіцелі ваенных аўтамабіляў, інструктары па ваджэнні баявых машын, сувязісты, спецыялісты па рамонце бранятанкавай тэхнікі. Пакуль на фоне бывалых салдат пачаткоўцы відавочна вылучаюцца: усе з прычоскай «пад нуль». Не аблегла на плячах новенькая ваенная форма, рухі часам няўпэўненыя. Хлопцы яшчэ не зусім асвоіліся ў вайсковым калектыве, не да ўсяго прызвычаіліся. Але гэта, як той казаў, справа нажыўная: салдатамі не нараджаюцца, імі становяцца.

У гэтай вучэбнай часці, якой камандуе падпалкоўнік Андрэй Чухлеб, адказна падрыхтаваліся да сустрэчы новага папаўнення. Навабранцам адвялі добраўпарадкаваныя ўтульныя памяшканні. Выдалі ўсё лепшае: новенькую ваенную форму, беласнежную пасцельную бялізну, мяккія матрацы і падушкі, пушыстыя коўдры. Словам, стварылі ўсе неабходныя ўмовы не толькі для службы, але і для жыцця.

Пра гэта пачаткоўцы ўжо ў першы дзень знаходжання ў арміі паспелі расказаць сваім бацькам па тэлефоне. Каб не хваляваліся: у казарме, дзе зроблены еўрарамонт, менш за 19 градусаў не бывае, у салдацкай сталовай кормяць смачна і сытна. А яшчэ ў кожным падраздзяленні ёсць плазменны тэлевізар, пральная машына, абсталяваныя бытавыя пакоі.

Радавы Васіль МАСАЛЬСКІ асвойвае абавязкі няштатнага цырульніка падраздзялення.

Працаваць з новым папаўненнем камандаванне вучэбнай часці даверыла самым вопытным і адказным афіцэрам і прапаршчыкам, здольным зацікавіць пачаткоўцаў службай. Увесь сяржанцкі састаў укамплектавалі з хлопцаў, за плячыма якіх як мінімум год працы з падначаленымі.

— Навабранцаў можна параўнаць з пластылінам: якіх салдат мы «вылепім» з іх, такімі яны і будуць, — заўважыў у гутарцы падпалкоўнік Андрэй Чухлеб. — Таму «ставіць на крыло» ўчарашніх школьнікаў і студэнтаў даверылі толькі самым лепшым камандзірам, якія, як той казаў, не раўняюць усіх пад адзін грэбень, а выкарыстоўваюць індывідуальны падыход.

Камандзір роты новага папаўнення капітан Валянцін Аўтуховіч працуе з моладдзю ўжо больш за пяць гадоў. Вопыту не займаць. Паглядзіць на навабранца — і адразу бачыць, які ключык падыходзіць да яго душы.

— Калі парог казармы пераступілі цяперашнія прызыўнікі, — падзяліўся назіраннямі дасведчаны афіцэр, — у вачах толькі некаторых заўважыў разгубленасць. У большасці ж хлопцаў — гарыць іскрынка цікавасці: да арміі, да яе ўкладу жыцця. А гэта сведчыць пра адно: прызыўнікі не напалоханыя службай, упэўненыя ў сабе.

Пасля водных працэдур і пераапранання ўзвод навабранцаў пакідае салдацкую лазню. Вяртаючыся ў казарму, па камандзе сяржанта Рамана Лапкоўскага паспрабавалі перайсці на страявы крок. І хоць атрымаўся «гарох», адчувалася ўсеагульнае старанне.

Сяржант Яраслаў ТАРАСЮК вучыць радавых Арцёма МАЙСЕВІЧА і Сяргея СТРАЛЬЧЭНЮ правільна падшываць падкаўнерык.

З чарговымі вайсковымі цяжкасцямі пачаткоўцам давялося сутыкнуцца пры запраўцы ложка, падшыванні падкаўнерыка, прасаванні абмундзіравання. Быццам невялікая хітрасць — падшыць беласнежны падкаўнерык. Але, як аказалася, для большасці гэта цэлая навука, якая непарыўна звязана з «іголкатэрапіяй».

— Нават не ўяўляў сабе, што гэта так складана, — адкрыта прызнаўся радавы Васіль Масальскі са Светлагорскага раёна, чарговы раз укалоўшы палец іголкай. — Да арміі мне ўсё рабіла мама, а тут вось самому давялося займацца «немужчынскай» справай.

А вось калегі «пакутніка», радавыя Арцём Майсевіч і Сяргей Стральчэня, пры падшыванні падкаўнерыка не лічылі ганебным звярнуцца па дапамогу да сяржанта Яраслава Тарасюка. Вопытны намеснік камандзіра ўзвода не толькі дапамог ім хутка справіцца з пастаўленай задачай, але і падказаў іншым навабранцам, як правільна абыходзіцца з ніткай і іголкай.

У цэлым жа, па словах ваеннага псіхолага — выкладчыцы вучэбнай часці лейтэнанта Ірыны Пазняк, жаданне служыць у навабранцаў ёсць. Прынамсі, ніводзін з салдат не прызнаўся падчас гутаркі, што хацеў бы прайсці вайсковую школу завочна. Акрамя таго, некаторыя не ўтойваюць, што ў войска прыйшлі па... ідэальную характарыстыку ад камандавання, каб пасля тэрміновай пайсці ў МНС, у органы правапарадку, у пазаведамасную ахову. Большасць жа навабранцаў ад службы хочуць, як яны кажуць, умацаваць малады арганізм, падтрэніраваць мышцы, набыць неабходныя веды і навыкі па ваенна-ўліковай спецыяльнасці, якія абавязкова спатрэбяцца ім у далейшым жыцці.

Выпускнік Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Сяргей Каўтуноў шчыра прызнаўся, што на службу прыбыў, каб сур'ёзна падрыхтаваць сябе да далейшага самастойнай жыцця, навучыцца граматна і без перагібаў працаваць з людзьмі. У яго «цывільнай» прафесіі выкладчыка фізічнай культуры гэта вельмі важна. А арганізатарскія здольнасці можна развіць толькі ў арміі.

Што ж, першыя ўражанні аб пачатку тэрміновай ваеннай службы ў навабранцаў добрыя. І гэта толькі настроіць іх на добрую службу.

Мікалай МАКАРЭВІЧ. Фота аўтара.
г. Барысаў

■ Творчыя матывы

ПОСПЕХ... У КАЗЦЫ



Сцэна са «Снежнай каралевы».

Нядаўна былі падведзены вынікі III рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія». З 37 дзяржаўных і прыватных тэатральных калектываў вызначылі пераможцаў. Сярод іх — і ваенныя артысты.

Лепшым спектаклем для дзяцей прызнана пастаноўка Драматычнага тэатра Беларускай Арміі «Снежная каралева». Славутая казка Андэрсена прынесла двайны поспех: актрыса тэатра Марына Дзянісава, якая сыграла галоўную ролю, атрымала ўзнагароду ў намінацыі «Лепшая акцёрская праца ў спектаклі для дзяцей».

— Наш тэатр славіцца добрымі казкамі, — пераканана Марына Дзянісава. — Магчыма, таму, што артысты любяць гэты жанр. Ды і дзеці — найбольш удзячная публіка, хоць і прыдзірлівая: іх не падманеш. У гэтым спектаклі наша задача была ў тым, каб у дзяцей склаўся правільны вобраз Снежнай каралевы, каб яны разумелі, што такое дабро, а што такое зло. У спектаклі я хацела паказаць, што за прыгажосцю, багаццем і ўладай часта стаяць адзіноцтва і пустата.

У той жа час актрыса прызнаецца, што гэта яе любімая роля. «Таму што мы вельмі шмат над ёй працавалі, прыдумлялі ўсялякія дэталі, каб вобраз быў дасканалым», — тлумачыць яна.

— А ці карыстаюцца папулярнасцю казкі ў сучасных дзяцей? — цікаўлюся я.

— Безумоўна! Амаль кожны вечар я іх чытаю свайму шасцігадоваму сыну. І ён іх вельмі любіць: простай і даступнай мовай там тлумачацца многія рэчы. Сучасныя мультфільмы гэтым пахваліцца, на жаль, не могуць. Аднак без мультымедыйных тэхналогій і нам ужо складана паставіць цікавы, якасны спектакль.

Любоў да казак у Марыны Дзянісавай з дзяцінства. Калі яна скончыла школу, бібліятэкар падарыла ёй фармуляр, куды запісвалася літаратура, і сказала: «Ты перачытала ўсе казкі, якія былі ў школьнай бібліятэцы». Але, нягледзячы на гэта, актрыса зноў з задавальненнем перачытвае іх. Праўда, глядзіць на многае ўжо па-іншаму, што і імкнецца ўвасобіць у сваіх казачных ролях.

Вераніка КАНЮТА

КЛЯТВА САПРАЎДНАГА ВОІНА

9 тысяч навабранцаў тэрміновай службы і рэзервістаў у розных кутках Беларусі ўрачыста прысягнулі на вернасць Радзіме.

Людзей у электрычцы на Барысаў так шмат, што яна нагадвае ранішні цягнік сталічнага метро. Тысячы дарослых мужчын і жанчын, маленькіх дзетак едуць у ваенны гарадок Печы на прысягу сваіх сыноў, братоў, жаніхоў, сяброў. Для кожнага падрыхтавана вялізная сумка з хатнімі прысмакамі. Ужо пасля прысягі салдаты атрымаюць першае звальненне, і гэтыя торбы адкрыюцца, у паветры залунаюць знаёмыя хатнія пахі.

Стоячы на страявым плацы 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра, кожны спрабуе ўбачыць свайго абаронцу Айчыны сярод сотняў ваеннаслужачых.

— Саня, усміхніся! — крычыць камусьці з хлопцаў з аўтаматамі вясёлы голас. — Армія толькі наперадзе!

У кагосьці напружанае чаканне выклікае добры настрой ад хуткай сустрэчы, а ў іншых — непакой.

— Хвалююся, безумоўна, — пераступае з нагі на нагу Яўген Раманаў, які на прысягу да ўнука Дзімы прыехаў з Віцебска і чакае доўгачаканай сустрэчы з ім у кампаніі з другім дзедам. — Пры Савецкім Саюзе я служыў у ракетных войсках асаблівага прызначэння. Сваякі тады не мелі магчымасці прысутнічаць на прысязе. А тут з'явіўся такі шанц, нельга яго не выкарыстаць.

Прысяга адбываецца хутка. І пасля праходжання ўрачыстым маршам перад гасцямі, хлопцы на некалькі хвілін трапляюць у абдымкі блізкіх, фатаграфуюцца, каб назаўжды пакінуць памяць аб гэтай значнай падзеі.

Фота Надзеі БУЖАН.

— У нас прысягу па традыцыі прымае шмат вайскоўцаў. Гэтым разам — каля 2 тысяч чалавек, — кажа гвардыі палкоўнік Рынат Муратаў, намеснік начальніка 72-га гвардзейскага Аб'яднанага вучэбнага цэнтра. — Безумоўна, для кожнага салдата гэта вельмі знамянальны дзень. Вы самі бачылі, колькі гасцей было на прысязе. Прысутнічаў генерал-маёр Міхаіл Пузікаў, намеснік міністра абароны. Зразумела, мы павінны былі паказаць, што іх тут ужо нечаму навучылі. У новага папаўнення было ўсяго два тыдні на падрыхтоўку, але прайшлі ўсе добра.

Як заўважыў намеснік міністра абароны, страявая падрыхтоўка была на добрым узроўні. Гэта, найперш, заслуга камандзіраў, а таксама саміх салдатаў, якія праявілі стараннасць і імкненне ў навучанні. Амаль кожны дзень я ладжу абходы, назіраю працэс баявой падрыхтоўкі і чую, як яны пазітыўна выказваюцца наконт службы. Задаволены ўмовамі, стаўленнем камандзіраў. І будзе вельмі добра, калі падобны настрой у іх захаваецца да заканчэння службы.

— Дарэчы, у Печах заўжды такі ажыятаж на прысязе?

— Рэч у тым, што мы рыхтуем новае папаўненне не толькі для сябе, але і для іншых воінскіх часцей. Два разы на год прыводзім да прысягі вялікую колькасць асабістага складу. Вы толькі ўявіце, да кожнага (а сёння тут прысягнулі 1700 з лішнім чалавек) прыязджаюць ад 5 да 10 гасцей. Зараз тут знаходзіцца каля 10 тысяч чалавек. А сёлета ў нас быў установлены сапраўдны рэкорд: да аднаго хлопца на прысягу прыехалі 42 чалавекі!

Тарас ШЧЫРЫ. *г. Барысаў.*

Хай загляне сонца ў кожнае ваконца!

Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці», якая праходзіць па ўсёй краіне, учора завітала і ў сталічны дзіцячы дом №3 «Жамчужынка».

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Дзетак-сірот з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця з надыходзячымі святамі павіншаваў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Уладзімір Цалко разам з прадстаўнікамі ААТ «Белінвестбанк», Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, упраўлення Следчага камітэта па г. Мінску і іншых арганізацый.

Нягледзячы на тое, што надвор'е зусім не нагадвае зіму, у дзіцячым доме ў гэты снежаньскі дзень было па-святочнаму прыгожа і ўтульна. Дзеткі — галоўныя героі навагодняй казкі — спявалі песні і вадзілі карагоды вакол ёлкі разам са сваімі выхавальнікамі, Чараўніцай Зімой, Машай і Мядзведзем і, вядома ж, Снягуркай і Дзедам Марозам. Але самым цудоўным сюрпрызам для кожнай «жамчужынкі», безумоўна, сталі падарункі ад Дзеда Мароза і гасцей свята. Мінпрыроды пры фінансавай падтрымцы замежнага прадпрыемства «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь» набыло для дзіцячага дома навагоднюю ілюмінацыю: святлодыёдны светлавы дождж і светлавы матыў «Алень».

— Словы падзякі ў першую чаргу трэба адрасаваць усім выхавальнікам і настаўнікам, бо каб працаваць з такімі «асаблівымі» дзецьмі, патрэбна мець шмат цярплівасці і дабрыні, адкрытае сэрца і высакародную душу, — сказаў Уладзімір Цалко. — Дзякуй вам, што клапоціцеся пра дзяцей і дапамагаеце дзяржаве іх выхоўваць і рыхтаваць да жыцця.

Як адзначыў міністр, у дзіцячым доме №3 усяго 48 выхаванцаў, але ў цэлым па краіне такіх дзетак каля 25000. Гэта дзеці з сацыяльна ненадзейных сем'яў, або тыя, ад якіх адмовіліся бацькі. І клопат дзяржавы аб гэтых дзецях — вельмі важная справа. Таму чыноўнікам, міністрам і іншым дзяржаўным дзеячам трэба часцей бываць у такіх месцах, бачыць, у якіх умовах працуюць настаўнікі і жывуць дзеці з псіхафізічнымі асаблівасцямі, падтрымліваць іх.

Вераніка КОЛАСАВА

■ Святкуем разам!

МАЛАДЫ 2015-ы:

ЧЫМ ЗАПОМНІЦЦА СУСТРЭЧА НОВАГА ГОДА Ў СТАЛІЦЫ?

Вы ўжо вырашылі, як праведзяце навагоднюю ноч і першы навагодні дзень? Калі не, то «Звязда» дапаможа вам разабрацца ў святочнай праграме сталіцы.

Старт святу дасць ужо традыцыйнае **навагоднее тэатралізаванае шэсце Дзядоў Маразоў і Снягурак.** Распачнецца яно 25 снежня аб 11-й гадзіне на Кастрычніцкай плошчы. Сёлета ў ім прымуць удзел больш за 500 герояў дзіцячых казак, фільмаў і мультфільмаў. Незвычайны парад пройдзе ў бок Палаца спорту, дзе адбудзецца тэатралізаваны паказ і будзе арганізавана канцэртная праграма.

Галоўнай пляцоўкай для сустрэчы Новага 2015-га стане плошча ля **Палаца спорту** (праспект Пераможцаў, 4). У 23 гадзіны 31 снежня распачнецца праграма «Новы год — 2015», якая скончыцца ў 4 раніцы 1 студзеня. Праводзіць Год гасціннасці і сустракаць Год моладзі каля Палаца будуць танцавальна-дыскатэчная праграмай з удзелам папулярных дыджэяў і эстрадных выканаўцаў. Кульмінацыяй свята традыцыйна стане феерверк каля стэлы «Мінск — горад-герой» 1 студзеня ў 1.00. А з 15 да 19 гадзін начныя гулянні тут заменіць іншая эстрадная праграма пад назвай «Прывітанне, Новы год!».

Навагоднія масавыя гулянні з гадзіны ночы да чатырох раніцы 1 студзеня адбудуцца і ля спарткомплекса «**Чыжоўка-Арэна».** Тут гледачоў чакае музычна-гульнявая праграма ад Дзеда Мароза і Снягуркі, віктарыны, конкурсы, гараскопы ад сімвала 2015 года — Казы, раставыя лялькі, а таксама канцэрт.

Як адзначылі ў Мінгарвыканкаме, у святочную ноч у горадзе будзе працаваць 21 канцэртная пляцоўка, размешчаны яны будуць ва ўсіх раёнах. Апроч таго, мноства навагодніх спектакляў для дзяцей і дарослых у гэтыя святочныя дні пройдуць у шматлікіх установах і канцэртных залах Мінска. Усяго ў дні зімовых свят у Мінску пройдзе каля 500 культурна-забаўляльных мерапрыемстваў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

Шэсце з размахам

У Віцебску адбылося грандыёзнае святочнае навагоднее шэсце, у якім бралі ўдзел каля 500 Дзядоў Марозаў і Снягурак, а таксама прыкладна 850 іншых казачных персанажаў. Каб правесці акцыю «Запалім ёлку разам», перакрылі рух транспарту ў цэнтры горада. Галоўныя падзеі адбыліся на плошчы Перамогі. Вядома, без сімвала наступнага года — Казы — не абышлося. Яе разам з калядnымі героямі везлі ў павозцы.

У апошні час у абласным цэнтры шэсці напярэдадні калядных і навагодніх свят праводзяцца з размахам. Насамрэч, калі святкаваць — дык святкаваць. І сёння Віцебск не адстае па ўзроўні святкавання ад чэшскіх, польскіх, французскіх гарадоў…

Горад літаральна стаў казачным, каб гараджане адчулі, што хутка святы. Гучала праз рэпрадуктары і родная мова: «А на зямлі беларускай спрадвеку ў зіму святкавалі вясёлыя Каляднікі! Спявалі песні, гулялі ў розныя гульні і вадзілі казу!»

Ва ўрачыстай цырымоніі запальвання галоўнай ёлкі разам з галоўнымі гарадскімі Дзедам Марозам і Снягуркай бралі ўдзел прадстаўнікі таленавітай моладзі. Гэтага гонару ўдастоіліся тыя, хто ў 2014 годзе праслaвіў сваю вобласць, свой горад перамогамі ў розных конкурсах, алімпіядах і чэмпіянатах. У ліку тых, хто падае надзеі, Арцём Баршчоў, вучань 8 класа гімназіі № 1, капітан маладзёжнай зборнай па хакеі г. Віцебска; Яўген Каліноўскі, вучань 10 класа гімназіі № 2, пераможца заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па геаграфіі, удзельнік міжнароднай алімпіяды па геаграфіі; Надзея Суздальцава, навучэнка Дзіцячай мастацкай школы г. Віцебска, лаўрэат X рэспубліканскага мастацкага конкурсу…

У гэты ж дзень заззялі святочныя агні 60 «малодшых сясцёр» віцебскай навагодняй ёлкі № 1, у тым ліку ў новых мікрараёнах. Святкаванні прадоўжацца да старога Новага года.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЭДКІЯ ГОСЦІ!

Рэчыца — горад не маленькі. І ёсць, і быў…

У канцы сямідзясятых я там працаваў у разведвальнай экспедыцыі — шукаў нафту. Сяброў ды прыяцеляў меў шмат.

І вось адзін з іх надумаў жаніцца, нас паклікаў на вяселле. Як тут адмовішся? Ды і навошта? Скінуліся мы па 25 рублёў, купілі ў падарунак радыёлу і паехалі — маладыя, прыгожыя, усе прыбраныя ў найлепшае (гэта значыць, у касцюмы, у белыя сарочкі ды гальштукі)…

Селі ў аўтобус Рэчыца — Хойнікі. Кіламетраў праз сорак прыехалі, праз добрую гадзіну — прыйшлі. Вёска палеская, глухамань… Такую не ўсе з нас і бачылі.

Але ж мы не з пужлівых. З'явіліся якраз да стала, уручылі маладым падарунак, выпілі па чарцы-другой, прыкусілі, сталі рвацца ў клуб на танцы. Музыка там іграе, нас, прыезджых, на белыя вальсы дзеўкі запрашаюць… «Усё пуцём», як той казаў: хораша гуляем! І доўга…

Нарэшце — хто раней, а хто і пад раніцу — прыходзім мы да бабулькі на начлег (хату загадзя паказалі). Ложкі там бачым, печ — таксама. Яно, канешне, лета, на дварэ цёпла, але ж дождж — мы досыць добра вымаклі, трэба неяк сушыцца. Адзенне паразвешвалі на крэслах ды цвіках. А туфлі куды? Хлопцы, гляджу, адсланілі печ, саставілі на прыпечак, а я свае — на чарон. Ды і сам туды ж, на ляжанку, на нейкія транты. І цёпленька там, і добранька. Праўда, мулка крыху. Але ж я выспаўся.

Гадзін у 11 сталі прачынацца. Бачым — бабулька наша крышанкі на стол ставіць, снедаць кліча. І мы б, што называецца, з дарагою душою. Толькі ж дзе абутак? Мой на чаране падсох, ёсць, а хлопцы босыя. Пытаем у бабулі, можа, яна куды прыняла? Тая глядзіць на нас падслепаватымі вочкамі, слухае, што мы кажам, а потым рукі як заломіць: «А хлопчыкі, а даражэнькія! А я ж думала, што гэта корчыкі ляжаць на распалку, што гэта галавешачкі… Ну і качаргой іх — пад дровы… Падпальваю і думаю, што за халера: чаму яны не ўгараюцца?».

Атрымліваецца, праспалі мы свой абутак! І што рабіць?

Пасядзелі, паелі тых бабуліных крышанак, закасалі калошы ды пайшлі на бяседу босыя: па лужынах, па лузе з кветкамі… Толькі жабы ў бакі.

Прыходзім на вяселле — людзі глядзяць на нас, смяюцца, кажуць, ну і сябры ў жаніха, ніколі такіх не бачылі (ну, каб босыя, і ў той жа час пры гальштуках…).

Але ж потым усёй грамадой знайшлі нам нейкі абутак: каму кірзачы прынеслі, каму гумовікі, каму пантофлі. У іх мы і дадому прыехалі.

Маладыя былі, усё пасавала, а найболей — добры настрой.

Мікалай ХАМІЦЭВІЧ,

в. Доўгае, Салігорскі р-н.

НІ ВЯРОЎКІ, НІ КАРОЎКІ

Калі б гэтую бываліцу расказаў мне хто іншы, нізавошта не паверыла б! А калі цётка Пашка… Яна за свае 90 з гакам і сама наўрад ці калі зманіла, і смерць як не любіць, каб іншы збрахаў.

Дык вось. Некалі ў вёсцы ніводная сям'я без каровы не жыла, хоць трымаць іх і досыць цяжка было, бо «на сподачку з блакітным беражком» сена ніхто не падносіў. Людзі самі летам стараліся: абкошвалі ўсе дарогі, няўдобіцы, ускрайкі лесу, выжыналіравуў кустах на беразе Дняпра… І зімой «сенаваць» хадзілі. Паедуць, напрыклад, мужыкі на луг па сена, а малыя цікуюць, калі будуць вяртацца. І ўжо тады лёцьма за падводамі, адзін перад адным падымаюць кожную пасмачку, што на сцежку зваліцца! А хто быў смялейшы з хлопчыкаў, дык той і з воза мог скубануць, але ж рызыкаваў, бо толькі добрыя дзядзькі рабілі выгляд, што гэтага не бачаць, а вось ліхія напагатове пугі трымалі.

І дарослыя таксама «ў сена» хадзілі. Не тонамі кралі, не ад добрага жыцця і, вядома ж, баючыся, бо ўвесь час, пакуль сена было на лугах, яго вартавалі.

…Той год, відаць, не спякотны быў. Жанкі падчас сенакосу назграбалі коп — проста безліч! А вось складзі іх у стагі чамусьці не паспелі. У выніку з нашай «гары́» (высокага берага Дняпра) усё гэтае багацце як на далоні відаць было. А значыць, і дражніла яно, і спакушала…

Вось адзін з мужыкоў (волат, дарэчы, Ілья Мурамец — рукі па метры!) і не ўтрымаўся: дачакаўся ночы, на сваёй абшыванцы пераплыў цераз раку, пасядзеў у кустах, паназіраў… Усё там ціха, здаецца: вартаўніка не чуваць, не відаць. Таму выбраў ён копку, раскінуў над ёй свае «метры», згроб ды панёс да лодкі.

Пакуль нёс, здалося, што цяжкаваты ахапак. Але ж падумаў (і правільна, дарэчы!), што ўдала ўзяў, што на вілкі столькі б не атрымалася.

Добранька данёс — пакінуў сена ў лодцы (яна адпавядала гаспадару — сваімі памерамі). Сам па новую копку вярнуўся. Яшчэ раз згроб — насцярожыўся: не зразумеў, чаму ахапак лягчэйшы…

Але ж думаць ды «ўзважваць» часу не меў: акуратненька ўсё ўвязаў, пераплыў назад. А там стаў пераносіць здабытак ў гумно. Верхні пласт, як тую пярынку, падняў, закінуў на тарпу, а вось ніжні, цяжэйшы… Рукі з ахапкам для разгону адвёў, наверх шпурлянуў, — а з сена… вартаўнік — п'яны ў дыміну.

…Як там што было, гісторыя замоўчвае. Факт, што паразумеліся мужыкі. Абодва ж віноватыя: адзін, што піў ды спаў на службе, другі — што красці пайшоў… Дамовіліся, што ніхто нічога нікому не скажа.

Але ж вёска не горад: людзі ўсё роўна пра ўсё даведаліся. А вось начальства — не… Ці, можа, выгляд зрабіла?

Я пра адно часам думаю: як жа змяніўся час! Раней, каб кароўку трымаць, людзі пад страхам ганьбы і турмы красці хадзілі. А цяпер толькі скажы — гатовага сена да гумна прывязуць… А не трэба ўжо — ні яго, ні каровы.

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

АДНО ЛЕЧЫШ…

З вясковай лазні, як з фэсту, — чаго толькі не прынясеш… Адзін мужык, пакуль мыўся, расказаў, як сваю жонку лячыў.

Значыць, скруціла ёй, беднай, сярэдзіну, ды так, што ні сесці, ні ўстаць! Канцы, здаецца, прыходзяць… А да доктара ж ісці не хочацца.

Нехта нараіў ёй на гарачай печы паляжаць, пагрэцца. Думае: палезу, можа, і праўда палепшае? Сагнулася ў тры пагібелі — і бачком, бачком… Неяк ускараскалася, ногі выцягнула там, ляжыць. Чуе — гаспадар у хату заходзіць. Яна яму зверху:

— Яначак, можа, ты спіну мне натрэш? Там у шафцы трохі настоечкі ёсць… Перац на спірце…

Яначак што — яго ўпрошваць не трэба, а тым больш калі размова пра спірт. Да таго ж спіну бабе церці — гэта не гной выкідаць.

Узяў ён тую бутэлечку, панюхаў, трохі каўтануў (добрая, халера!), з рэшткамі падступіўся да печы. А жонка ўжо чакае, падрыхтавалася: ніцма лягла і так, як належыць: галава на падушцы, вышэй, спіна — ніжэй і ўжо голая…

Муж ля сцягна прыладкаваўся. Далонь сваю коўшыкам зрабіў і думае, колькі ж туды настойкі ўліць? Калі кроплю якую, рука сухая будзе — а паясніца, не раўнуючы, як стальніца, — значыць, не натрэш. А калі шмат — тады ж… сабе не застанецца!

Факт, што думу ён думае, маракуе, а тая «лодачка» дрыжыць. І рука з бутэлькай — таксама. Нахіліў ён яе… І, здаецца ж, не моцна, а настойка адтуль як плюхне… І праз пальцы… І якраз жонцы на хрыбет. А потым (ведама, вадкасць) — па «раўчучку» ніжэй… І яшчэ ніжэй…

Жонка як падхопіцца, як ускочыць, як кінецца з печы… І за мужыком… Крычыць:

— Вар'ят! Што ты нарабіў?!.

А ён толькі азірнуўся ды кажа:

— Ты прасіла спіну палячыць, вось я і палячыў: ты ж глянь, як параўнялася!

Сціхла кабета — прыслухалася… І сапраўды: сярэдзіна, здаецца, меней баліць. Значыць, муж палячыў-такі? А калі б пры гэтым і не «скалечыў» яшчэ, далібог бы чарку наліла!

Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,

в. Магільна, Уздзенскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

белагропромбанк
традиции будущего

ДОГОВОР
СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА)
«БОЛЬШИЕ ДЕНЬГИ 2.0» №

г. _____ «___» _____20__ г.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»), именуемое в дальнейшем «Вкладополучатель», в лице _____, действующего на основании _____, с одной стороны, и _____, именуемый в дальнейшем «Вкладчик» с другой стороны, далее совместно именуемые «Стороны», заключили настоящий договор о нижеследующем.

1. Вкладчик вносит наличными или перечисляет безналичным путем денежные средства в белорусских рублях на вкладной (депозитный) счет №3414_____ / _____ в день заключения настоящего договора, а Вкладополучатель принимает их, обязуется обеспечить их сохранность и возвратить наличными денежными средствами, либо безналичным путем (по усмотрению Вкладчика) сумму вклада (депозита) и начисленные проценты в порядке и на условиях, предусмотренных настоящим договором.

2. Вид договора банковского вклада (депозита): срочный.

3. Сумма вклада (депозита) на дату внесения (перечисления) вклада (депозита):

Сумма вклада (депозита) цифрами	Сумма вклада (депозита) прописью	Валюта вклада (депозита)
		Белорусские рубли

4. Срок хранения денежных средств на вкладном (депозитном) счете составляет 35 (Тридцать пять) календарных дней с ___.___._____ по ___.___._____. Дата наступления срока возврата вклада (депозита): ___.___._____.

5. Вклад (депозит) и причитающиеся по нему проценты выплачиваются в валюте вклада (депозита).

6. Процентная ставка по вкладу (депозиту) на дату подписания настоящего договора составляет ____ (_____) процентов годовых. Процентная ставка по настоящему договору является фиксированной.

7. В случае истребования Вкладчиком суммы вклада (депозита) до наступления даты его возврата (досрочное расторжение договора) Вкладополучатель обязан выплатить истребуемую сумму наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении), в течение 5 (Пяти) календарных дней со дня предъявления требования Вкладчика в письменной форме.

8. Вкладополучатель имеет право в одностороннем порядке прекратить (приостановить) прием дополнительных взносов во вклад (депозит) с уведомлением об этом Вкладчика на своих информационных стендах, официальном сайте Вкладополучателя в сети Интернет.

9. За несвоевременный возврат (по вине Вкладополучателя) денежных средств с вкладного (депозитного) счета Вкладчика или несвоевременную выплату (по вине Вкладополучателя) начисленного дохода Вкладополучатель обязан уплатить Вкладчику пеню в размере 0,01 (Ноль целых одной сотой) процента от несвоевременно возвращенной (выплаченной) суммы за каждый календарный день просрочки.

10. Если Вкладчик не потребует возврата вклада (депозита) в срок, предусмотренный пунктом 4 настоящего договора, то срок хранения денежных средств продлевается (пролонгируется) на срок, аналогичный первоначальному, на условиях настоящего Договора с установлением процентной ставки, определенной для данного вида вклада (депозита) решением уполномоченного органа Вкладополучателя и действующей на день продления срока хранения денежных средств. Пролонгация вклада (депозита) в соответствии с данным пунктом допускается один раз.

11. Иные условия по настоящему договору, являющиеся обязательными для исполнения Сторонами, определяются Условиями договора срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» «Большие деньги 2.0», которые являются неотъемлемой частью настоящего договора и официально опубликованы в газете «Звязда» от ___.___._____ № ___, на официальном сайте ОАО «Белагропромбанк» в сети Интернет (www.belapb.by) и размещены на информационных стендах Вкладополучателя.

12. В случае неисполнения Вкладополучателем обязательств по настоящему договору возврат денежных средств Вкладчику осуществляется путем выплаты истребуемой суммы наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении), в течение 5 (Пяти) календарных дней со дня предъявления требования Вкладчика в письменной форме. В случае неисполнения Вкладополучателем обязательства по возврату вклада (депозита) по обстоятельствам, предусмотренным законодательством, устанавливающим гарантированное возмещение банковских вкладов (депозитов) физических лиц, возврат вклада (депозита) производится в установленном этим законодательством порядке.

13. Спорные вопросы, возникающие при исполнении настоящего договора, решаются путем проведения переговоров Сторон. При недостижении согласия споры по настоящему договору рассматриваются судом в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.

14. Настоящий договор составлен в двух экземплярах, имеющих одинаковую юридическую силу, по одному для каждой из Сторон.

15. Настоящий договор вступает в силу с момента поступления денежных средств на вкладной (депозитный) счет Вкладчика и действует до момента полного возврата Вкладополучателем Вкладчику суммы вклада (депозита) и начисленных процентов по вкладу (депозиту) (закрытия вкладного (депозитного) счета).

16. Сохранность и возврат вкладов (депозитов) физических лиц гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

17. Вкладчик подтверждает, что он ознакомлен и согласен с Условиями договора срочного банковского вклада (депозита) «Большие деньги 2.0».

Вкладополучатель:
ОАО «Белагропромбанк»
220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3
(лицензия на осуществление банковской деятельности № __ от _____ 20__ г., выданная Национальным банком Республики Беларусь)
_____
Адрес:_____
Телефон: _____
БИК: _____
Должность:_____
_____ _____
подпись фамилия, инициалы

Вкладчик:
Документ, удостоверяющий личность:
Номер: _____
Выдан: _____
Дата выдачи: ___.___._____
Адрес: _____
_____
Телефон: _____
_____ _____
подпись фамилия, инициалы

Отношение к США в рамках
Закона США «О налогообложении
иностранных счетов» (FATCA)
□ не имею
□ имею
_____ _____ _____
(подпись) (фамилия и инициалы) (дата)

ДОГОВОР
СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА)
«БОЛЬШИЕ ДЕНЬГИ 2.0» №
на имя _____
(фамилия, имя, отчество)

г. _____ «___» _____20__ г.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»), именуемое в дальнейшем «Вкладополучатель», в лице _____, действующего на основании _____, с одной стороны, и _____, именуемый в дальнейшем «Вкладчик» с другой стороны, далее совместно именуемые «Стороны», заключили настоящий договор о нижеследующем.

1. Вноситель вносит наличными или перечисляет безналичным путем денежные средства в белорусских рублях на вкладной (депозитный) счет №3414_____ / _____ в день заключения настоящего договора, а Вкладополучатель принимает их, обязуется обеспечить их сохранность и возвратить наличными денежными средствами, либо безналичным путем (по усмотрению Вкладчика) сумму вклада (депозита) и начисленные проценты в порядке и на условиях, предусмотренных настоящим договором.

2. Вкладчиком по настоящему договору является:

1) Вноситель, до момента предъявления
_____
(фамилия, имя, отчество лица на имя которого внесен вклад (депозит) полностью) (реквизиты документа, удостоверяющего личность)

в дальнейшем именуемым «Другое лицо», Вкладополучателю в письменной форме первого требования, основанного на правах в отношении данного вклада (депозита);

2) Другое лицо, после предъявления им Вкладополучателю в письменной форме первого требования, основанного на правах в отношении данного вклада (депозита).

3. Вид договора банковского вклада (депозита): срочный.

4. Сумма вклада (депозита) на дату внесения (перечисления) вклада (депозита):

Сумма вклада (депозита) цифрами	Сумма вклада (депозита) прописью	Валюта вклада (депозита)
		Белорусские рубли

5. Срок хранения денежных средств на вкладном (депозитном) счете составляет 35 (Тридцать пять) календарных дней с ___.___._____ по ___.___._____. Дата наступления срока возврата вклада (депозита): ___.___._____.

6. Процентная ставка по вкладу (депозиту) на дату подписания настоящего договора составляет ____ (_____) процентов годовых. Процентная ставка по настоящему договору является фиксированной.

7. Вклад (депозит) и причитающиеся по нему проценты выплачиваются в валюте вклада (депозита).

8. В случае истребования Вкладчиком суммы вклада (депозита) до наступления даты его возврата (досрочное расторжение договора) Вкладополучатель обязан выплатить истребуемую сумму наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении), в течение 5 (Пяти) календарных дней со дня предъявления требования Вкладчика в письменной форме.

9. Вкладополучатель имеет право в одностороннем порядке прекратить (приостановить) прием дополнительных взносов во вклад (депозит) с уведомлением об этом Вкладчика на своих информационных стендах, официальном сайте Вкладополучателя в сети Интернет.

10. За несвоевременный возврат (по вине Вкладополучателя) денежных средств с вкладного (депозитного) счета Вкладчика или несвоевременную выплату (по вине Вкладополучателя) начисленного дохода Вкладополучатель обязан уплатить Вкладчику пеню в размере 0,01 (Ноль целых одной сотой) процента от несвоевременно возвращенной (выплаченной) суммы за каждый календарный день просрочки.

11. Если Вкладчик не потребует возврата вклада (депозита) в срок, предусмотренный пунктом 5 настоящего договора, то срок хранения денежных средств продлевается (пролонгируется) на срок, аналогичный первоначальному, на условиях настоящего Договора с установлением процентной ставки, определенной для данного вида вклада (депозита) решением уполномоченного органа Вкладополучателя и действующей на день продления срока хранения денежных средств. Пролонгация вклада (депозита) в соответствии с данным пунктом допускается один раз.

12. Иные условия по настоящему договору, являющиеся обязательными для исполнения Сторонами, определяются Условиями договора срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» «Большие деньги 2.0», которые являются неотъемлемой частью настоящего договора и официально опубликованы в газете «Звязда» от ___.___._____ № ___, на официальном сайте ОАО «Белагропромбанк» в сети Интернет (www.belapb.by) и размещены на информационных стендах Вкладополучателя.

13. В случае неисполнения Вкладополучателем обязательств по настоящему договору возврат денежных средств Вкладчику осуществляется путем выплаты истребуемой суммы наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении), в течение 5 (Пяти) календарных дней со дня предъявления требования Вкладчика в письменной форме. В случае неисполнения Вкладополучателем обязательства по возврату вклада (депозита) по обстоятельствам, предусмотренным законодательством, устанавливающим гарантированное возмещение банковских вкладов (депозитов) физических лиц, возврат вклада (депозита) производится в установленном этим законодательством порядке.

14. Спорные вопросы, возникающие при исполнении настоящего договора, решаются путем проведения переговоров Сторон. При недостижении согласия споры по настоящему договору рассматриваются судом в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь.

15 Настоящий договор составлен в трех экземплярах, имеющих одинаковую юридическую силу, по одному для каждой из Сторон. Третий экземпляр договора хранится у Вкладополучателя и по требованию Другого лица выдается ему. При этом Другое лицо учиняет на экземпляре договора Вкладополучателя надпись «1 экземпляр договора получил», с указанием своей фамилии, инициалов и заверяет своей подписью.

16. Настоящий договор вступает в силу с момента поступления денежных средств на вкладной (депозитный) счет Вкладчика и действует до момента полного возврата Вкладополучателем Вкладчику суммы вклада (депозита) и начисленных процентов по вкладу (депозиту) (закрытия вкладного (депозитного) счета).

17. Сохранность и возврат вкладов (депозитов) физических лиц гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

18. Вкладчик подтверждает, что он ознакомлен и согласен с Условиями договора срочного банковского вклада (депозита) «Большие деньги 2.0».

Вкладополучатель:
ОАО «Белагропромбанк»
220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3
(лицензия на осуществление банковской деятельности № __от _____ 20__ г., выданная Национальным банком Республики Беларусь)
_____
Адрес:_____
Телефон: _____
БИК: _____
Должность:_____
_____ _____
подпись фамилия, инициалы

Вкладчик:
Документ, удостоверяющий личность:
Номер: _____
Выдан: _____
Дата выдачи: ___.___._____
Адрес: _____
_____
Телефон: _____
_____ _____
подпись фамилия, инициалы

Отношение к США в рамках
Закона США «О налогообложении
иностранных счетов» (FATCA)
□ не имею
□ имею
_____ _____ _____
(подпись) (фамилия и инициалы) (дата)

УСЛОВИЯ ДОГОВОРА СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА)
«БОЛЬШИЕ ДЕНЬГИ 2.0»

Настоящие условия договора срочного банковского вклада (депозита) «Большие деньги 2.0» (далее – Условия) являются неотъемлемой частью договора срочного банковского вклада (депозита) «Большие деньги 2.0» (далее – Договор), заключаемого ОАО «Белагропромбанк» (далее – Вкладополучатель) и физическим лицом (далее – Вкладчик), и определяют обязательные для сторон Договора права, обязанности и иные условия.

1. Общие условия по вкладу (депозиту).

1.1. Размер минимальной суммы первоначального взноса во вклад (депозит) составляет 3 000 000 (Три миллиона) белорусских рублей.

1.2. Сумма вклада (депозита), валюта вклада (депозита), размер процентов, срок возврата вклада (депозита) и иные существенные условия, предусмотренные законодательством Республики Беларусь, указываются в Договоре.

2. Права и обязанности Сторон.

2.1. Вкладополучатель обязуется:

2.1.1. В день наступления срока возврата вклада (депозита) начислить на сумму вклада (депозита) проценты в размере, предусмотренном пунктом 6 Договора и выплатить их путем присчисления к основной сумме вклада (депозита).

2.1.2. По окончании срока хранения вклада (депозита) выплатить сумму вклада (депозита) наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении).

2.1.3. В случае востребования Вкладчиком суммы вклада (депозита) до наступления даты его возврата (досрочное расторжение Договора) выплатить истребуемую сумму наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в платежном поручении (заявлении) в течение 5 (Пяти) календарных дней со дня предъявления требования Вкладчика в письменной форме.

2.1.4. Хранить банковскую тайну вклада (депозита) в порядке, предусмотренном законодательными актами Республики Беларусь.

2.2. Вкладчик обязуется:

2.2.1. Уведомлять Вкладополучателя в письменной форме не позднее, чем за 5 (Пять) календарных дней о намерении досрочно расторгнуть Договор.

2.2.2. В срок до 10 (Десяти) календарных дней с момента изменения информировать Вкладополучателя обо всех изменениях данных документа, удостоверяющего его личность и (или) места жительства (а также об изменении фамилии, имени, отчества, данных документа, удостоверяющего личность физического лица, на имя которого вносится вклад (депозит),— для Договора на имя другого лица).

2.3. Вкладополучатель имеет право:

2.3.1. В одностороннем порядке производить перенумерацию лицевого счета, вызванную изменением законодательства Республики Беларусь, правил ведения бухгалтерского учета, реорганизацией (изменением организационной структуры) Вкладополучателя, изменением программного обеспечения, используемого для проведения операций, без предварительного уведомления Вкладчика и заключения дополнительного соглашения.

2.3.2. Списывать платежным ордером, если иное не предусмотрено законодательством Республики Беларусь, со счета Вкладчика денежные средства, зачисленные на счет в результате технической ошибки.

2.4. Вкладчик имеет право:

2.4.1. До наступления срока возврата вклада (депозита) истребовать сумму вклада (депозита), в порядке, определенном пунктом 2.2.1. настоящих Условий.

2.4.2. Пополнять сумму вклада (депозита) в соответствии с настоящими Условиями и Договором путем внесения дополнительных взносов во вклад (депозит) в валюте вклада (депозита) наличными денежными средствами или путем безналичного перечисления в соответствии с законодательством Республики Беларусь, если Вкладополучателем не приостановлен (не прекращен) прием дополнительных взносов.

2.4.3. На востребование в день пролонгации и в период после пролонгации присчисленных ко вкладу (депозиту) процентов. При востребовании части вклада (депозита) в сумме, не превышающей размера присчисленных ко вкладу (депозиту) процентов, перерасчет процентов по частично истребуемой сумме не производится.

2.4.4. Сумма приходных операций по вкладу (депозиту) при их совершении наличными денежными средствами или путем безналичного перечисления в соответствии с законодательством Республики Беларусь не может быть менее 10 000 (Десяти тысяч) белорусских рублей.

2.4.5. Распоряжаться вкладом (депозитом) лично либо через представителя.

2.4.6. Выдавать доверенности и оформлять завещательные распоряжения по вкладу (депозиту) в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Доверенности на получение представителем выплат и завещательные распоряжения правами на денежные средства по вкладу (депозиту) могут быть удостоверены непосредственно в подразделении Вкладополучателя, в котором заключен Договор, если иное не установлено Вкладополучателем и (или) законодательством Республики Беларусь.

2.4.7. Получать выписки по вкладному (депозитному) счету.

3. Порядок начисления и выплаты процентов по вкладу (депозиту).

3.1. При начислении процентов по вкладу (депозиту) количество дней в году принимается равным 365 (или 366) и точное количество календарных дней в месяце.

3.2. Проценты по вкладу (депозиту) начисляются Вкладополучателем со дня поступления суммы вклада (депозита) на вкладной (депозитный) счет Вкладчика включительно по день, предшествующий дню возврата вклада (депозита). Если дата возврата денежных средств по вкладу (депозиту) приходится на нерабочий день, то возврат денежных средств по вкладу (депозиту) производится в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. При этом проценты по вкладу (депозиту) за нерабочие дни начисляются и уплачиваются по ставке, установленной по вкладу (депозиту).

3.3. При начислении процентов по вкладу (депозиту) учитываются фактические ежедневные остатки денежных средств на вкладном (депозитном) счете.

3.4. При досрочном возврате вклада (депозита) (досрочном расторжении Договора) по требованию Вкладчика проценты по вкладу (депозиту) за период его фактического хранения начисляются по ставке, действующей по вкладу (депозиту) «до востребования» в белорусских рублях на дату совершения операции, присчисляются к сумме вклада (депозита) и выплачиваются Вкладчику вместе с суммой вклада (депозита) наличными денежными средствами или безналичным перечислением на счет, указанный Вкладчиком в Заявлении, в размере, предусмотренном Договором.

3.5. При досрочном возврате пролонгированного вклада (депозита) начисление процентов по ставке, действующей по вкладу (депозиту) «до востребования» в белорусских рублях на дату совершения операции, производится только за период со дня продления срока хранения денежных средств по день, предшествующий дню досрочного возврата вклада (депозита).

3.6. Если Вкладчик не потребует возврата вклада (депозита) в срок после его пролонгации Вкладополучатель платежным ордером, если иное не предусмотрено законодательством Республики Беларусь, перечисляет сумму вклада (депозита) с учетом начисленных процентов на счет по учету вкладов (депозитов) «До востребования» физических лиц. Со дня указанного перечисления на сумму вклада (депозита) проценты ежемесячно начисляются и присчисляются к сумме вклада (депозита) в размере, установленном по вкладу (депозиту) «До востребования» в белорусских рублях. Процентная ставка по вкладу (депозиту) «До востребования» может быть в одностороннем порядке изменена Вкладополучателем с предварительным уведомлением Вкладчика путем опубликования указанной информации в газете «Звязда», на официальном сайте ОАО «Белагропромбанк», на информационных стендах Вкладополучателя. Датой предварительного уведомления является дата опубликования сведений в газете «Звязда». При этом в случае увеличения Вкладополучателем размера процентной ставки, ее новый размер применяется к вкладу (депозиту) со дня, указанного в решении уполномоченного органа Вкладополучателя, но не ранее дня предварительного уведомления. В случае у

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 40 (257)

■ Прэм'ера

СМЕЙСЯ, ПАЯЦ, НАД РАЗБІТЫМ КАХАННЕМ...

ТЭАТР — МЕСЦА, ДЗЕ ВІРУЮЦЬ СТРАСЦІ

Пакрыўджаны муж забівае жонку літаральна на сцэне, на вачах у публікі. Гэта не тэлеперадача Андрэя Малахава. Але прыклад таго, як тэатральная драма можа стаць драмай жыцця. А ў наш час — яшчэ і падставай для відэасюжэтаў, выкрывальных артыкулаў, «жоўтых» рэпартажаў. Вось і папарацы ўжо на месцы, абступілі месца здарэння з усіх бакоў, гатовыя раздзьмуць сенсацыю… Яны таксама сталі героямі спектакля «Паяцы» Нацыянальнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, хоць першапачаткова ўсё ж гэта была гісторыя драматычнага кахання тых, хто іграе каханне перад іншымі.

Пра гэта захацеў расказаць італьянскі кампазітар Руджэра Леанкавала ў асобнай оперы. Асновай для лібрэта стала рэальная гісторыя, сапраўдны выпадак забойства акцёрам жонкі і яе каханка, які абмяркоўваўся ў сям'і кампазітара, бацька якога працаваў у судзе. Што называецца, запала ў душу, і калі спатрэбілася зрабіць оперу актуальную, блізкую да рэальнасці, да жыцця, то гісторыя атрымала сцэнічнае ўвасабленне. Прычым лібрэта да оперы кампазітар напісаў сам. Таму, акрамя прыгожай музыкі, яму трэба дзякаваць за прыгожыя словы, частка з якіх пайшла ў народ, стала пазнавальнай — тут трэба ўдакладніць, што так атрымалася з-за таго, што гэтая опера гучала ў перакладзе (асобныя арыі сталі асабліва папулярнымі), але цяпер, калі ў нашым тэатры твор ідзе па-італьянску, то вядомыя словы самі прыходзяць на памяць.

Асабліва, калі сваю арыю спявае Каніа (артыст Сяргей Франкоўскі), які вельмі кахае Неду (Ніна Шарубіна), але падазрае, што з яе боку няма таго ж пачуцця. «Дапамагаюць» пераканацца ў нявернасці жонкі так званыя «добразычліўцы», што заўсёды побач з сямейнымі парамі, у якіх не ўсё ладзіцца, і толькі падкідаюць дроў у агонь пачуццяў, а то і наўпрост спрыяюць разладу, нацкоўваючы людзей адно на аднаго. Адзін з такіх — адхілены Недай Тоніа — проста помсціць жанчыне, распальвае рэўнасць Каніа, у выніку чаго і здараецца трагедыя. Пры тым, што Неда — у вобразе Каламбіны — разыгрывае сцэну кахання з Арлекіна. Нам падказваюць пра камізм пастаноўкі гэтага «тэатра ў тэатры» — на сцэне з'яўляецца вялізнае бліскучае кураня, якое пэўны час прыцягвае ўвагу. Толькі фінал атрымліваецца зусім не па сюжэце, які іграюць артысты. Мала таго, яшчэ адной ахвярай становіцца закаханы Сільвіа, які назірае за ўсім збоку (за сцэнай у нашым варыянце), але не можа стрымаць сябе… Камедыя пра Каламбіну і Арлекіна ператвараецца ў трагедыю людзей. І што тут скажаш, акрамя сакраментальнага «фініта ля камедыя», прыдуманага самім Леанкавала.

Нягледзячы на тое, што опера напісана напрыканцы XIX стагоддзя, насамрэч адчуваеш, што не змянілася сутнасць тэатра як з'явы, якую ствараюць адны людзі для іншых.

Адметна, што твор, прысвечаны тэатру, сёлета адкрываў міжнародны калядны оперны форум. І двойчы адметна тое, што адкрыццём форуму стала менавіта прэм'ера оперы «Паяцы», першыя яе паказы. Пры тым, што рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Панджавідзэ прапанаваў сваё прачытанне тэмы «паяцаў», герояў сцэны. Гэта прачытанне сучаснае, на яго працуе галоўная рэжысёрская канцэпцыя, калі жыццё акцёраў сапраўды знаходзіцца пад прыцэлам — увагі, фотаапаратаў, тэлекамер. На гэта працуе і шмат іншых рэчаў, якія дапамагаюць адчуць, што ёсць тэатр: тут і рэпетыцыйныя залы, дзе займаюцца артысты, тут і станкі для балетных танцораў, і самі яны выконваюць эпізод-нумар з сучаснай харэаграфіяй (яе стварыла Вольга Костэль). Тут і грымёркі са стыльнымі столікамі і люстэркамі, і работнікі сцэны ў працоўных камбінезонах, і шмат іншых дэталяў, якія дапамагаюць зразумець, што акцёры — таксама людзі са сваімі праблемамі, якія жывуць сярод нас. Нягледзячы на тое, што опера напісана напрыканцы XIX стагоддзя (прэм'ера адбылася ў Мілане ў 1892 годзе), насамрэч адчуваеш, што не змянілася сутнасць тэатра як з'явы, якую ствараюць адны людзі для іншых. Іншыя — тут жа. Хор у оперы (хормайстар-пастаноўшчык Ніна Ламановіч) выконвае спеўную нагрузку, але яшчэ і дадаткова працуе на пастановачную задачу: гэта гледачы, якія спяшаюцца на спектакль (вось жа ходзяць па зале, шукаюць свае крэслы, зараз, здаецца, цябе згоняць!), а калі трэба — то і сведкі трагедыі, папарацы і проста надта цікаўныя асобы. Дадатковая жывінка, якая дазваляе гледачам нібыта паглядзець збоку і на самі сябе, задумацца пра тое, чаго мы сёння чакаем ад артыстаў, за што мы іх любім, чаму цікавімся іх жыццём, якое адбываецца за кулісамі тэатра, ці гатовыя бачыць у іх людзей, якія пакутуюць і глыбока перажываюць не толькі на сцэне? Чаго мы наогул шукаем у тэатры?

У оперным — найперш, вядома, сустрэчы з музыкай (дырыжор-пастаноўшчык «Паяцаў» — Віктар Пласкіна). Яна падкрэслівае драматызм усёй тэатральна-чалавечай гісторыі, нездарма гэта самая вядомая і запатрабаваная опера Р. Леанкавала. Нездарма розныя трупы прапаноўваюць яе асучасненыя інтэрпрэтацыі. У нас, напэўна, па ўвасабленні (асабліва па тым, як выглядаюць галоўныя героі ў жыцці, у якіх касцюмах яны выходзяць) варыянт больш блізкі да класічнага, аднак падкрэслены сучасны кантэкст самой тэмы оперы. Што ўжо нямала — пры тым, што большасць пастановак беларускай оперы менавіта класічныя. Наша публіка на іх скіравана (ці прывучана). Тут нешта іншае. І няхай.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

■ Кінакрокі

У СНЕЖНІ 14-ГА…

ЯК АДЗНАЧЫЛІ ЮБІЛЕЙ БЕЛАРУСКАГА КІНО

Беларускія кінематаграфісты і тыя, хто мае да экраннага мастацтва непасрэднае дачыненне, адзначылі 90-годдзе беларускага кіно. Урачыстая цырымонія з гэтай нагоды стала своеасаблівым трыумфам для некаторых дзеячаў кіно: у гэты дзень узнагародамі былі адзначаны не толькі творчыя людзі, але і адміністратары, інжынеры, рабочыя (не хочацца гаварыць пра іх — простыя).

На пачатку святочнага мерапрыемства ў Доме кіно адбылося гашэнне новай паштовай маркі з подпісам «90 гадоў беларускаму кіно» на канверце з лагатыпам «Беларусьфільма».

Гісторык кіно, кінакрытык, доктар мастацтвазнаўства (кажуць, беларускі Ален Дэлон) Анатоль КРАСІНСКІ прэзентаваў сваю кнігу «Гісторыя майго кіно» і паабяцаў напісаць яшчэ. Наклад кнігі невялікі і, як сказала кінакрытык, загадчыца аддзела экранных мастацтваў Акадэміі навук Антаніна КАРПІЛАВА, кніга ўжо стала рарытэтам: «Тут вельмі дакладна, пераканаўча, кранальна расказана пра сяброў, пра такіх, напрыклад, асоб, як Алесь Адамовіч, Віктар Тураў, Элем Клімаў»…

«Не магу сказаць, што я неяк задумаў і напісаў кнігу. Проста ішло жыццё, былі сустрэчы і ў Мінску, і ў Маскве, і на ўсіх прасторах вялікага Савецкага Саюза. Усе мы былі сябры, таварышы, было шмат знаёмых выдатных людзей: акцёраў, рэжысёраў, кіназнаўцаў. Мне здаецца, я дастаткова поўна ўсё гэта асвятліў, пра гэта расказаў. Цікава ж, як было ў 30-я, у 40-я, што было ў Саюзе кінематаграфістаў, якая была сітуацыя»,— сказаў на прэзентацыі Анатоль Красінскі.

Урачыстая цырымонія, якая сабрала, мабыць, усіх, хто мае дачыненне да сферы кіно, была прысвечана менавіта ўзнагародам, каб у дзень юбілею адзначыць кінематаграфістаў. Рэжысёр Міхаіл Пташук некалі, маючы на ўвазе беларускае кіно, сказаў: «Студыя ўвесь час жыве выпадковымі сцэнарыямі, выпадковымі рэжысёрамі». Да чаго я гэта ўзгадала: да юбілеяў мы традыцыйна падыходзім з думкай аб падвядзенні вынікаў, добрых ці

Былы міністр культуры і дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» Яўген ВАЙТОВІЧ атрымаў узнагароду ад міністра культуры Барыса СВЯТЛОВА.

дрэнных (на гэты раз знайшліся і тыя, і іншыя), і вынікі гэтыя гучалі ўвесь год.

Нельга сказаць, што ўрачысты юбілейны вечар паказаў усю прафесійную палітру дзеячаў беларускага кіно. Несумненна, за кожнага, хто атрымаў узнагароду з рук віцэ-прэм'ера Анатоля Тозіка, міністра культуры Барыса Святлова, дырэктара Белтэлерадыёкампаніі Генадзя Давыдзькі і іншых, можна парадавацца. Толькі некага сярод узнагароджаных, здаецца, не хапала. Рэжысёраў, акцёраў, драматургаў, якія ствараюць сучаснае кіно, нягледзячы на бясконцыя праблемы, адсутнасць фінансавання, невыразныя перспектывы. Сярод намінантаў не было некаторых гучных імёнаў, сапраўды апантаных людзей, прысутнасці якіх абавязкова чакаеш у такі дзень…

Але гісторыю мы ўспаміналі амаль увесь год у выглядзе рэйтынгаў, кніг, публікацый.

Кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла DVD-калекцыю «Залаты тузін» з выдатных фільмаў, у якіх адрэстаўравалі гук і выяву. Нацыянальны конкурс на кінафестывалі «Лістапад» таксама прыйшоўся да месца і часу — якраз у юбілейны год.

Каментарыі, водгукі, спадзяванні гучаць можа не так святочна, як хацелася б, але ганарыцца нам ёсць чым. Каб высветліць, чым менавіта, і што нам даў шлях ад утварэння дзяржаўнага ўпраўлення па справах кінематаграфіі і фатаграфіі Наркамасветы Беларускай ССР да сучаснай індустрыі, упершыню быў створаны рэйтынг беларускіх фільмаў. Узяліся за гэтую справу аддзел экранных мастацтваў НАН, Гільдыя кінакрытыкаў Беларускага Саюза кінематаграфістаў, Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і часопіс «На экранах». У апытанні ўдзельнічалі 24 эксперты кіно. Кожны з іх складаў свой рэйтынг з 20 фільмаў па ўсіх відах кіно — ігравое, тэлевізійнае, дакументальнае, анімацыйнае. Лічыліся балы, падводзіліся вынікі. Усё, каб высветліць, у чым слава беларускага кіно. І слава, і гонар, і поспех — сапраўды былі. Але таксама важна сёння спадзявацца на нешта не менш выдатнае і таленавітае. Таму з надзеяй глядзім у будучыню.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

■

Ад рэдакцыі: *Спецыяльны карэспандэнт рэдакцыі газеты «Звязда» Ірэна Кацяловіч атрымала ганаровую грамату Міністэрства інфармацыі «за добрасумленную плённую працу па асвятленні пытанняў усебаковага развіцця нацыянальнага кіно і ў сувязі з 90-годдзем беларускага кінематографа». Віншуем маладую калегу і зычым ёй новых творчых поспехаў!*

Рэйтынг ігравых фільмаў

Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» (да 1939 г.— «Савецкая Беларусь») 1926–2013 гг.

1. «Ідзі і глядзі» Элема Клімава, 1985 (сумесная вытворчасць «Беларусьфільм» — «Масфільм»)
2. «Чужая бацькаўшчына» Валерыя Рыбарава, 1983.
3. «Я родам з дзяцінства» Віктара Турава, 1966.
4. «Дзікае паляванне караля Стаха» Валерыя Рубінчыка, 1979.
5. «Праз могілкі» Віктара Турава, 1964.
6. «Вянок санетаў» Валерыя Рубінчыка, 1976.
7. «Знак бяды» Міхаіла Пташука, 1986.
8. «Усходні калідор» Валянціна Вінаградава, 1966.
9. «Альпійская балада» Барыса Сцяпанава, 1966.
10. «Горад майстроў» Уладзіміра Бычкова, 1965.
11. «Людзі на балоце» Віктара Турава, 1982.
12. «Дзяўчынка шукае бацьку» Льва Голуба, 1959.
13. «У жніўні 44-га …» Міхаіла Пташука, 2000.
14–15. «Шукальнікі шчасця» Уладзіміра Корш-Сабліна, 1936.
14–15. «Мяне завуць Арлекіна» Валерыя Рыбарава, 1988.
16. «Культпаход у тэатр» Валерыя Рубінчыка, 1982.
17–18. «Лясная быль» Юрыя Тарыча, 1926.
17–18. «Да заўтра» Юрыя Тарыча, 1929.
19. «Белыя Росы» Ігара Дабралюбава, 1983.
20. «Ваўкі» Аляксандра Колбышава, 2009.

Рэйтынг дакументальных фільмаў студыі «Летапіс»

Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» 1944–2013 гг.

1. «У вайны не жаночы твар» (цыкл фільмаў 1981–1984 гг.) Віктара Дашука.
2. «Я з вогненнай вёскі» (цыкл фільмаў 1975–1978 гг.) Віктара Дашука.
3. «Мы жывём на краі» Віктара Аслюка, 2002.
4. «Кола» Віктара Аслюка, 2002.
5. «Тонежскія бабы» Валерыя Рыбарава, 1977.
6. «Хатынь, 5 км» Ігара Колаўскага, 1969.
7. «Божа мой» Галіны Адамовіч, 2004.
8. «Боль» Сяргея Лук'янчыка, 1988.
9. «Дзевяноста шостая восень» Віктара Дашука, 1980.
10. «Тэатр часоў перабудовы і галоснасці» Аркадзія Рудэрмана, 1987.
11. «Драўляны народ» Віктара Аслюка, 2011.
12. «Дарога на Курапаты» Міхаіла Жданоўскага, 1990.
13. «Завядзёнка» Галіны Адамовіч, 2005.
14. «Яго закапалі ў шар зямны» Анатоля Алая, 1989.
15. «Conanima» («З душой») Міхаіла Жданоўскага, 1992.
16. «Ва ўсе дні» Міхаіла Жданоўскага, 2008.
17. Цыкл фільмаў-назіранняў «Урок даўжынёю ў год», 1963–1988, «Вяртанне ў 10 А» Вадзіма Сукманава, Рычарда Ясінскага, Самуіла Фрыда.
18. «Кінааматар. Восеньскі сон» Вольгі Дашук, 2011 г.
19. «Салдатка» Юрыя Марухіна, 1974.
20. «Васіль Быкаў. Узыходжанне» Віктара Дашука, 1985.

БУСЛІНЫ, СОНЕЧНЫ КРАЙ…

Менавіта такою паўстае наша краіна ў творах, якія аздабляюць залы Палаца Незалежнасці

Год таму ў сталіцы з'явіўся Палац Незалежнасці — новы асяродак культуры. Культуры ў самым шырокім сэнсе слова — палітычнай, эканамічнай, культуры зносін і, вядома ж, культуры творчасці. За год у залах Палаца Незалежнасці адбылося нямала знакавых не толькі для нашай краіны, але і для ўсяго свету падзей.

Відаць, нікога не трэба пераконваць у тым, што добразычлівая, працоўная і ў той жа час урачыстая атмасфера сустрэч і перамоў у многім залежыць ад агульнага настрою, атмасферы таго месца, дзе яны адбываюцца. Можам з гонарам сцвярджаць, што не толькі архітэктары, але і мастакі зрабілі ўсё, каб у залах Палаца Незалежнасці праз вобразы, колеры, рытміку ліній перадаць сам дух нашай Бацькаўшчыны — зямлі мірнай, добразычлівай, шчодрай. Сёння мы пагаворым пра серыю карцін для адной з зал палаца, над якімі працавалі вядомыя далёка за межамі нашай краіны выдатныя жывапісцы, графікі, майстры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Уладзімір Вішнеўскі, Віталь Герасімаў, Андрэй Савіч, Уладзімір Савіч, Рыгор Сітніца і Леанід Хобатаў.

Усе мастакі — вядомыя ў нашай краіне асобы. Але, галоўнае, што іх усіх яднае,— гэта тое, што яны любяць і выдатна ведаюць родны свой край. Беларусь, якую яны адкрылі і не стамляюцца адкрываць не толькі нам, але і ўсяму свету, стала для кожнага з іх галоўнаю тэмаю творчасці.

Людзей найлепш яднаюць агульная праца і прыгожыя святы. У другой палове дваццатага стагоддзя філосафы нават заўважылі, што на змену «чалавеку разумнаму» прыйшоў «чалавек святкуючы». У нашай мове слова «свята» суадносіцца са словам «святое». Свята — гэта не бяздумная весялосць, а заўжды далучанасць да традыцый свайго народа, а праз іх — да Вечнасці. І першае палатно — «Беларускі дом. Восень. Свабода. Танец» — шматгалоснае, паўнагучнае, вяртае нас да традыцыйнага беларускага Вяселля. Колеры, гукі роднай зямлі канцэнтруюцца ў народных строях, ручніках, у жывых, пазнавальных характарах. Сама прырода шчодра вітае маладых кветкамі і сакавітымі пладамі. А франтон новага дома, парог якога рыхтуюцца пераступіць маладыя, пазначаны традыцыйным для Беларусі салярным (сонечным) знакам. Мы баронімся ад зла дабром, мы сцвярджаем сваю незалежнасць, руплівa працуючы на сваёй роднай, Богам дадзенай нам зямлі.

Куды запрашаюць гасцей? На свята. Дзе, як не ў святочных строях адзення, дзе, як не ў песнях, музыцы, танцах раскрываецца душа народа? Мастакі прапануюць здзейсніць святочнае падарожжа па Беларусі. Вось «Падняпроўе. Зіма. Каляды». І пад сонцам снег шчодра раскрывае ўсе адценні белага. Зорка, звязда, у руках калядоўшчыкаў успрымаецца знакам шчасця і дабрабыту. Нашы продкі былі мудрыя людзі. І паступова многія хрысціянскія святы і традыцыі натуральна спалучыліся з традыцыйнымі народнымі. Прырода, як і Бог, вучыць чалавека быць міласэрным, шчырым, добразычлівым, вучыць любіць і кахаць.

Яшчэ адзін твор — «Панямонне. Лета. Купалле» — вяртае нас да самага таемнага, прыгожага беларускага свята Купалля (хрысціяне якраз у гэты час адзначаюць Нараджэнне Іаана Хрысціцеля). Мастакі з'ядналі ў адзіным каларыце дзве стыхіі — ваду і агонь — і па-над усім вясёлкавым ззяннем вылучылі жывую, рэальную кветку шчасця — нашу Папараць-кветку. «Падзвінне. Браслаўшчына. Восень. Дажынкі» ўражвае пазнавальнай бесконцаю далягляду і нагадвае пра шчодрасць нашай зямлі. Плады, каласы, кветкі… Вынік руплівай, нялёгкай працы на зямлі. І як жа хораша яны глядзяцца на бялюткіх рукатворных ільняных тканінах! А вось палатно «Цэнтральная Міншчына. Ткацтва. Слуцкія паясы» прысвечана нашым здабыткам культурным. Слуцкія паясы — гэта не толькі ўнікальныя творы мастацтва, сведчанне высокага прафесіяналізму і адметнага густу нашых майстроў. Гэта яшчэ і знак нашай высокай культуры і цывілізаванасці ў гістарычным кантэксце. Мы вяртаемся да часоў Вялікага Княства Літоўскага, дзе мусім шукаць вытокі сваёй прагі незалежнасці, сваёй гістарычнай годнасці і прызнанай ужо тады ў свеце беларускай мовы. Слуцкія паясы — гэта і адвечная непарыўная сувязь нашага прафесійнага мастацтва з народнай традыцыяй. У рытміцы слуцкіх паясоў, кажуць навукоўцы, чытаецца рытміка народных ручнікоў.

Мы маем шчодрую зямлю, нам ёсць што ахоўваць. І тут мастакі знаходзяць дакладныя мастацкія вобразы-алегорыі. У палатне «Брэстчына. Беловежская пушча» сама прырода ахоўвае наш Беларускі дом. Сімвалічнае Дрэва жыцця, што сягае каранямі глыбока ў гісторыю і цягнецца галінкамі, на якіх спяваюць птушкі, да неба, у будучыню, ахоўваюць мужныя, непахісныя зубры. А ў нябеснай прасторы, сягаючы да сонца, кружаць буслы. Усе творы натхняюць і быццам нагадваюць: тут, на Беларусі, людзі ўмеюць працаваць і святкаваць. Тут шануюць традыцыі, гісторыю і з надзеяй глядзяць у будучыню.

Гэта выдатна ведаюць аўтары серыі палотнаў у Палацы Незалежнасці, што ў алегарычнай, блізкай па стылістыцы да традыцыйнай народнай мастацкай мовы форме, здаецца, увасабляюць адвечнае ахоўнае кола, ахоўнае поле Беларусі. Усе мастакі — вядомыя ў нашай краіне асобы, яны актыўна ўдзельнічаюць у выстаўках і пленэрах, з'яўляюцца аўтарамі знакавых для беларускага мастацтва твораў. Але, галоўнае, што іх усіх яднае,— гэта тое, што яны любяць і выдатна ведаюць родны свой край. Яны, класікі сучаснага мастацтва, прыехалі вучыцца ў сталіцу з розных куткоў Беларусі, а потым з эцюднікамі і альбомамі аб'ехалі яе ўсю: яны замалёўвалі яе краявіды, людзей, помнікі, яны бачылі ў ёй тое, што можа ўбачыць толькі мастак… Беларусь, якую яны адкрылі і не стамляюцца адкрываць не толькі нам, але і ўсяму свету, стала для кожнага з іх галоўнаю тэмаю творчасці. У скарбніцы беларускай графікі ўвайшлі ўнікальныя па мелодыцы лініі і вобразаў афорты да кнігі «Вянок беларускіх народных песень» Уладзіміра Вішнеўскага, серыя шчымлівых, дарагіх кожнаму беларусу вясковых малюнкаў «Святло адвечнае» Рыгора Сітніцы. Віталь Герасімаў убачыў Каложу і іншыя помнікі нашай архітэктуры ў іх жывапіснай, містычнай еднасці з навакольнай прыродай. Выдатны жывапісец Леанід Хобатаў — адзін з аўтараў мастацкага рашэння станцыі метро «Няміга». Уладзімір Савіч яшчэ напачатку свайго творчага шляху, па сутнасці, вывеў вобразныя формулы-архетыпы нашай культуры — напрыклад, адкрыў нам, як падобны постаці жанчын у намітках на схіленыя пад ветрам ядлоўцы — і здолеў перадаць праз каларыт нават «Смак мёду». І Андрэй Савіч, самы малады з усіх, углядаючыся ў структуру вострасучасных вобразаў, у пошуках камертона гармоніі раз-пораз вяртаецца да той самай непарушнай для кожнага з нас атлантыды традыцый. Пры ўсёй абагуленасці, алегарычнасці кампазіцый у Палацы Незалежнасці, яны нават у дэталях этнаграфічна дакладныя. Пры ўсёй дэкаратыўнай паўнагучнасці маюць у сабе ўласцівы толькі нашай зямлі камертон гармоніі і суладнасці, да якога добра было б, каб прыслухаліся ў свеце.



«Беларускі дом. Восень. Свабода. Танец». Палатно, змешаная тэхніка, 2013.

Галіна БАГДАНАВА.

Не толькі архітэктары, але і мастакі зрабілі ўсё, каб у залах Палаца Незалежнасці праз вобразы, колеры, рытміку ліній перадаць сам дух нашай Бацькаўшчыны — зямлі мірнай, добразычлівай, шчодрай.

■ Формула ўдачы

Упісацца ў багему

Маладыя оперныя галасы, якія пачула Беларусь, папоўняць трупы тэатраў свету

Конкурсы існуюць для таго, каб нараджаць зорак. Першы Мінскі міжнародны конкурс вакалістаў быў цікавы тым, што «зорак» прадставіў — у фінале маладым спевакам дапамагалі славутыя і маладыя (але ўжо вядомыя) артысты беларускага тэатра і, вядома, аркестр разам з дырыжорам Вячаславам Волічам. І вось яна, прыкмета на ўдачу: праспяваць з Настассяй Масквіной, нашым цудоўным сапрана. Заслужаная артыстка Беларусі была партнёркай па нумару **канкурсанта з Узбекістана Раміза Усманава** *(на фота)*. Яны выканалі сцэну Мімі і Рудольфа з першай дзеі оперы Пучыні «Багема». Ды так прачула, што гледачы адразу адчулі: нешта будзе. Артысты не проста спявалі, сыгралі эпізод, і малады ўзбекскі тэнар прыпаў да сцэнічнай Мімі, на што публіка адрэагавала апладысментамі: гэта ўжо не як канкурсант, гэта ўжо як артыст, які ўжыўся ў вобраз. Журы гэта адзначыла: гран-пры міжнароднага конкурсу ў Мінску прысуджана Рамізу Усманаву.

Трэба патлумачыць, што далёка не для ўсіх гэтае імя новае. Дакладна не новае для айчыннай публікі: узбекскі тэнар ужо ўдзельнічаў у спектаклях беларускай оперы як запрошаны госць, таксама як і ў ранейшых калядных оперных форумах, у гала-канцэртах. Насамрэч малады спявак у сябе на радзіме працуе ў опернай трупе Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра імя А. Наваі ў Ташкенце, ён ужо заслужаны артыст Узбекістана. І гэта не першы міжнародны конкурс, дзе талент артыста ацанілі высока. Але ў Мінску ён узяў гран-пры і 10 тысяч еўра.

Трошкі менш (7 тысяч еўра) атрымае наша зямлячка Марыя Шабуня — за першую прэмію ў конкурсе. І гэта фактычна перамога для дзяўчыны, якая вучыцца на 4-м курсе Беларускай акадэміі музыкі (клас загадчыцы кафедры спеваў Т. Цыбульскай). Але прозвішча для айчынных аматараў музыкі таксама знаёмае (у тым ліку і дзякуючы сям'і дзяўчыны). Але яна і сама даказала, якая цудоўная Разіна з яе можа быць у пастаноўцы: разам з народным артыстам Беларусі Уладзімірам Пятровым (Фігара) яны праспявалі дуэт з оперы «Сівільскі цырульнік». Акрамя таго, дзяўчына атрымала заахвочвальную прэмію ад аднаго з членаў журы — а гэта, як правіла, магчымасць завязаць творчыя стасункі з адным з замежных тэатраў.

Украінка Валянціна Федзянёва павязе з Мінска 5 тысяч еўра як адзнаку за другую прэмію ў конкурсе. Ёй прынесла поспех руская класіка: Таццяна з оперы П. Чайкоўскага «Яўген Анегін». А вось грузінскі барытон Лаша Сесіташвілі быў пераканаўчы ва ўрыўку з оперы Дж. Вердзі «Травіята». Разам з заслужанай артысткай Беларусі Аленай Бундзелевай яны выканалі дуэт Віялеты і Жэрмона. У выніку — трэцяя прэмія (і 3 тысячы еўра).

Прыемна было і тое, што ў фінале конкурсу выступілі чацвёра беларускіх вакалістаў. Самы вядомы з нашых канкурсантаў Ілья Сільчукоў, саліст Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, атрымаў заахвочвальную прэмію журы ў памеры 1 тысячы еўра. Таксама адзначаны персанальным заахвочваннем праз магчымасць папрацаваць у адным з замежных тэатраў наш спявак Аляксандр Рославец. А публіка шчыра вітала і Паўла Пятрова: трапіць у лік 11 фіналістаў конкурсу, дзе напачатку было 155 удзельнікаў з 20 краін,— таксама вялікі поспех. І магчымасць прыслухацца да яго тэнара (ва ўрыўку з «Травіяты») — можа, будзе ў тэатры папаўненне?

Лепшых маладых артыстаў, лаўрэатаў конкурсу можна было пачуць у гала-канцэрце, які завяршыў праграму міжнароднага каляднага опернага форуму.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

Вось і ласось!

Вазьміце хрумсткую лусту духмянага пшанічнага хлеба. Дастаньце з маразільніка крыху прымарожанае сметанковае масла. Пакладзіце яго на хлеб. Адрэжце шчодры кавалачак слабасалёнага філе ласося «Санта Брэмар» і пакладзіце на масла. Дадайце невялікі кавалачак лімона і палавінку аліўкі, побач — пару лісцікаў пятрушкі. Цяпер нахіліцеся як мага ніжэй да свайго «твора» і зрабіце глыбокі ўдых. А-а-а-ах...

Цяпер паспрабуйце гэта не з'есці. А пасля не паўтарыць усё ад самага пачатку.

У імя прыгажосці

Чалавек ніколі не адмовіцца ад такога далікатэсу, як ласось. Дарэчы, вы памятаеце самых вядомых прадстаўнікоў ласасёвых рыб? Так, гэта сёмга, фарэль, гарбуша, кета і г.д. Уся гэта рыба не проста смачная, але яшчэ і надта карысная дзякуючы свайму ўнікальнаму саставу.

Перш за ўсё, рыба ў прынцыпе — выдатная крыніца высакаякаснага бялку і незаменных амінакіслот.

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць поліненасычаныя тлустыя кіслоты амега-3 і амега-6. Гэты комплекс вельмі важны для нашага арганізма, паколькі ўмацоўвае нервовую сістэму, паніжае ўзровень «дрэннага» халестэрыну, а значыць, прафілактуе атэрасклероз.

Ласось змяшчае такія мікраэлементы, як калій, магній, фосфар, жалеза, ёд, фтор, вітаміны A, D, E, B_6, B_{12}. Пералічаныя рэчывы спрыяюць умацаванню косцевай і зубной тканак, паляпшаюць стан скуры, валасоў, пазногцяў.

Такім чынам, той, хто ўжывае сёмгу і фарэль, дапамагае арганізму ажыццяўляць шэраг жыццёва важных працэсаў.

Так што, прагнеце прыгажосці і маладосці — ешце ласасёвую рыбу.

Закупілі — і ў вытворчасць

Купілі сёмгу «Санта Брэмар»? Будзьце ўпэўнены, што з'ясце не проста смачную і карысную рыбу. Вы набылі бяспечны прадукт высокай якасці. Для гэтага ён прайшоў працяглы шлях.

«Санта Брэмар» набывае для перапрацоўкі ахалоджаную рыбу найвышэйшай якасці ў Нарвегіі, у сертыфікаваных пастаўшчыкоў.

Каб захаваць карысныя і каштоўныя рэчывы і атрымаць пасля прадукт з высокімі смакавымі і якаснымі характарыстыкамі, кампанія імкнецца даставіць сыравіну ад пастаўшчыкоў непасрэдна на прадпрыемства ў самыя кароткія тэрміны — на 3-4-я суткі пасля ўлову. Сыравіна адразу ж накіроўваецца на перапрацоўку. Тэхналагічны цыкл вытворчасці ласасёвай прадукцыі — гэта складаны, працаёмкі працэс.

Трэба адзначыць, што на ўсіх этапах вытворчасці прымяняюцца сучасныя сродкі для санітарнай апрацоўкі абсталявання, строга вытрымліваюцца праграмы тэхналагічнага і санітарнага кантролю. Неабходна таксама дадаць, што на заводзе працуе высокакваліфікаваны персанал. Усё гэта разам і паасобку працуе на тое, каб спажывец атрымаў гатовы прадукт самай высокай якасці.

Дзе пачынаецца бяспека?

Перапрацоўка ахалоджанай сыравіны пачынаецца з дасканалага мыцця. Далей рыба накіроўваецца на сучасныя аўтаматычныя лініі, дзе разбіраецца на філе.

Ахалоджанае філе падвяргаецца сур'ёзнаму кантролю па многіх параметрах: якасць апрацоўкі, колер, кансістэнцыя, пах і іншыя фізіка-хімічныя паказчыкі. Пасля такога кантролю філе адпраўляецца на пасол.

Саленне ласасёвых рыб адбываецца з выкарыстаннем марской солі і натуральнага экстракту размарыну. Размарын, як вядома, з'яўляецца магутным натуральным антыаксідантам, дзякуючы якому прадукцыя застаецца свежай максімальна працяглы час. Выкарыстанне марской солі ў працэсе вытворчасці дазваляе атрымаць прадукт з «далікатнай», сакавітай кансістэнцыяй.

Пасол і выспяванне ажыццяўляюцца ў спецыяльных камерах, дзе пастаянна падтрымліваецца неабходная тэмпература, вільготнасць і цыркуляцыя паветра для раўнамернага прасольвання філе. У выніку масавая доля солі ў рыбе дасягае 4-х працэнтаў — гэта тое, што трэба.

Па завяршэнні працэсу прасольвання гатовае слабасалёнае філе накіроўваецца на вытворчасць гатовай прадукцыі.

Для атрымання падвэнджанага філе прымяняецца ашчаднае вэнджанне ў аўтаматызаваных камерах з выкарыстаннем натуральных альховых трэсак.

На спецыяльных аўтаматычных лініях філе нарэзаецца на патрэбныя порцыі, якія цяпер можна і ўпакаваць.

Упаковачны матэрыял усяляк абараняе нашы порцыі, у тым ліку ад ультрафіялету, а таксама не дазваляе развівацца шкоднай мікрафлоры.

Умееце выбіраць?

Прыгадаем, што трэба ведаць, набываючы ласося ва ўпакоўцы.

✔ Колер мяса ласося можа быць ад светла-ружовага да ярка-чырвонага (як правіла, сёмга мае светла-ружовы колер, фарэль — больш цёмны).

✔ Кансістэнцыя павінна быць сакавітай і тугой.

✔ Упакоўка павінна шчыльна прылягаць да рыбы, у якой не павінна быць ні бурбалак, ні расолу.

✔ Прадукт не павінен змяшчаць кансервантаў і фарбавальнікаў.

✔ Гарантам здзяйснення добрай пакупкі з'яўляюцца значкі сертыфікацыі прадукцыі: СТБ, ISO, HACCP.

Пакаштуйце, калі ласка

Піца з сёмгай

- *Цеста для піцы.*
- *Соус для піцы.*
- *Мука.*
- *Сыр «Мацарэла».*
- *Мяккі сыр.*
- *Падвэнджаная сёмга «Санта Брэмар».*
- *Кунжут.*
- *Пятрушка.*

100 г сёмгі парэжце на тонкія палоскі.

200 г цеста пакладзіце на пасыпаны мукой стол, раскачайце рукамі да круглай формы дыяметрам 30 см. Абтрасіце з дыска муку.

Соус для піцы размяркуйце лыжкай ад цэнтра да краёў піцы, пакідаючы 1–2 см не змазанымі. Абадок пасыпце кунжутам.

На соус пакладзіце сыр «Мацарэла» — каля 100 г. Па крузе чайнай лыжкай пакладзіце пяць астраўкоў любога мяккага сыру.

Выпякайце да поўнай гатоўнасці.

Перакладзіце піцу на талерку. Размясціце палоскі ласося паміж астраўкамі сыру ў выглядзе прамянёў.

Пасыпце пятрушкай.

Рулецікі з фарэлі з агуркамі і мяккім сырам

- *Слабасалёная фарэль «Санта Брэмар».*
- *Гуркі.*
- *Мяккі сыр («Маскарпоне» або «Філадэльфія», можна ўзяць густую смятану).*

Адзін гурок нарэжце тонкімі доўгімі брусочкамі, другі — скрылікамі. 200–250 г фарэлі нарэжце лустачкамі.

Змажце рыбу мяккім сырам. Упоперак пакладзіце брусочкі гурка.

Скруціце ў рулецік, парэжце кавалачкамі таўшчынёй 1–2 см.

Рулецікі пакладзіце на скрылікі гуркоў.

Тартар з фарэлі

- *Падвэнджаная фарэль «Санта Брэмар».*
- *Маянэз.*
- *Карнішоны.*
- *Чырвоная цыбуля.*
- *Лімон.*
- *Зяленіва.*
- *Смажаныя тосты.*

Пасмажце 15 тостаў.

Дробна парэжце крыху чырвонай цыбулі і карнішонаў.

На дробныя кубікі парэжце 200 г фарэлі.

Перамяшайце фарэль з 3 ст.л. маянэзу.

Дадайце парэзаныя цыбулю і карнішоны, перамяшайце.

Атрыманую масу размяркуйце па тостах.

Упрыгожце тосты зяленівам, паліце лімонным сокам.

Ружовыя паўмесяцы

- *Грэйпфрут.*
- *Філе сёмгі «Санта Брэмар».*

Падзяліце грэйпфрут на долькі, выдаліце перапонкі.

Парэжце 150–200 г сёмгі.

Абгарніце долькі ломцікамі сёмгі, зафіксуйце зубачысткамі.

Святлана БАРЫСЕНКА, Аляксандр ФУРСАЎ.

УНП 200656098

Извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Радиоволна» 28 января 2015 года в 10.00

Наименование предмета торгов, характеристика	Лот № 1	Местонахождение имущества:	Начальная цена с учетом НДС, руб. / Сумма задатка, руб.
	Капитальное строение с инв. № 400/С-88945 (административно-бытовое здание) общей площадью 124,5 кв.м, одноэтажное, 1990 г.п., материал – брус. Составные части и принадлежности: веранда (2 шт.), терраса, пешеходная дорожка, ограждение из металлической сетки на ж/б столбах, ворота металлические, калитка металлическая (2 шт.), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 422087507101000427 площадью 0,1874 га (срок аренды – до 01.04.2113 г.)	Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Озерская, д. 16	407 328 401 / 40 732 840

О проведении повторного аукциона (понижение начальной цены на 20%) по продаже имущества ОАО «Радиоволна» 28 января 2015 года в 10.30

Наименование предмета торгов, характеристика	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3	Лот № 6	Лот № 8	Лот № 9	Лот № 10	Лот № 11
	Изолированное помещение с инв. № 400/D-89156 (зал совещаний) общей площадью 3461,1 кв.м, находится в кирпичном капитальном строении, 1983 г.п., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004442	Седельный тягач, МАЗ 543208, 2003 г.в.	Грузовой автомобиль, МАЗ 53362, 1998 г.в., фургон тентовый	Грузовой автомобильный полуприцеп МАЗ 9758012, бортовая платформа тент, 2003 г.в.	Грузовой автомобиль, КАМАЗ 5320, 1993 г.в, бортовая платформа	Пассажирский микроавтобус, УАЗ 220694033, 2007 г.в., 10-местный вагон	Грузовой автомобиль, ЗИЛ - 431410, 1987 г.в., бортовая платформа	Грузовой автомобиль специальный, ГАЗ-САЗ 3508, 1991 г.в., самосвал с 3-сторонней выгрузкой
Начальная цена с учетом НДС, руб.	13 383 321 600	136 515 840	45 839 040	91 474 560	39 269 760	35 886 720	29 409 600	12 119 040
Сумма задатка, руб.	669 166 080	6 825 792	2 291 952	4 573 728	1 963 488	1 794 336	1 470 480	605 952
Местонахождение имущества	г. Гродно, ул. М. Горького, 89							

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» № 154 от 16.08.2014 г., № 193 от 10.10.2014 г.

Сведения о продавце: ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. М. Горького, 89, тел. 8(0152) 437272.

Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код 739, УНП 500481906.

Торги состоятся по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8.

Телефоны для справок в г. Гродно: (0152) 77 23 79, 74 49 11.

СРОК ПОДАЧИ ДОКУМЕНТОВ: по 22 января 2015 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8.

Условия участия, порядок проведения аукциона, срок заключения договора и условия оплаты размещены на сайте организатора торгов **www.fincentr.by.**

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) «СИСТЕМА СБЕРЕЖЕНИЙ ЛИНИЯ РОСТА 2.0» **с 20 декабря 2014 года**

% годовых

Сумма депозита, ед. валюты	Сроки: до 6 месяцев (90–180 дней)	от 6 месяцев до 1 года (181–370 дней)	от 1 года до 2 лет (371 – 740 дней)	от 2 до 5 лет (741 – 2000 дней)
Белорусские рубли				
1 – 10 000 000	28,0	29,0	30,0	30,3
10 000 001 – 50 000 000	28,1	29,1	30,1	30,4
50 000 001 и более	28,2	29,2	30,2	30,5
Доллары США, Евро				
1 – 500	4,5	5,7	6,0	6,3
501 – 5 000	4,6	5,8	6,1	6,4
5 001 и более	4,7	5,9	6,2	6,5
Российские рубли				
1 – 15 000	8,40	8,80	9,10	9,30
15 001 – 150 000	8,50	8,90	9,15	9,40
150 001 и более	8,60	9,00	9,20	9,50

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.
www.belapb.by
белагропромбанк традиции будущего
Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Извещение о проведении 15 января 2015 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)	**Самолет «CESSNA CITATION X»*, девятиместный, с двумя турбореактивными двигателями, серийный номер 750-0300, регистрационный номер ОЕ-НАК, 2009 год выпуска, цвет белый с красным**
Начальная цена	20 213 018 300 белорусских рублей
Сумма задатка	2 000 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22

** Имущество реализуется без эксплуатационной (технической) документации.*

Местонахождение продаваемого имущества – территория аэропорта «Минск-1».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 №559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **15 января 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 22.12.2014 по 13.01.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22; (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирные жилые дома № 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой № 1, Проектируемой № 2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей»

Сведения о застройщике.

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566.

Юридический адрес: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3, Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет КУП «УКС Центрального района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 20 по ул. Камайская;
- жилой дом № 12 по ул. Камайская;
- жилой дом № 15 по ул. Ратомская;
- жилой дом № 16 по ул. Мястровская.

Цель проекта – строительство жилого дома № 14 по генплану в составе объекта «Многоквартирные жилые дома по г/п №№ 11, 12, 13, 14 в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий»» общей площадью 12,3 тыс.кв.м, в том числе общая площадь квартир – 10,4 тыс.кв.м.

Вид строительства: новое строительство.

Начало строительства – 8 сентября 2014 года.

Окончание строительства – ноябрь 2015 года.

Проектные решения: Жилой дом запроектирован 9-этажным 4-секционным, всего квартир – 162, в том числе однокомнатных – 36 шт., двухкомнатных – 72 шт., трехкомнатных – 54 шт. Секции оборудованы лифтами на 630 кг со скоростью 1,0 м/с, и мусоропроводом. В техническом подполье запроектированы помещения для инженерного обслуживания дома – помещение ИТП и электрощитовая. Входы в техподполье выполнены непосредственно снаружи.

При входных группах в каждую секцию предусмотрено место для пандуса.

Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями.

В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, предусмотрено устройство вторых эвакуационных выходов на лоджию с глухим простенком от торца лоджии и балкона до оконного проема не менее 1,2 м.

Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками; облицовка конструкций приямков и крылец плитами искусственного камня.

Окна – деревянные по СТБ 939-93 с одинарным остеклением (двухкамерный стеклопакет).

Витражи остекления лоджий – из профилей ПВХ.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2010 № 671-15/10. Участок площадью 0,7073 га передан КУП «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома от 13.03.2014 № 591(1) (до 1 августа 2015 года).

Получено разрешение на организацию стройплощадки Госстройнадзора от 08.09.2014 № 2-209Ж-031/14. Получено разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство работ от 26.09.2014 №2-209Ж-031/14.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,8% общей площади жилого дома.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий предлагаются:

6 (шесть) однокомнатных квартир (номера №№ 38, 41, 42, 44, 48, 86);

10 (десять) двухкомнатных квартир (номера: №№ 2, 3, 37, 40, 46, 92, 93,128, 129, 160);

10 (десять) трехкомнатных квартир (номера: №№ 1, 4, 5, 32, 91, 94, 95, 123, 127, 130).

Стоимость 1 м² нормативной площади жилья с учетом затрат, не входящих в сводный сметный расчет, на момент заключения договора долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: 12 681 334 (Двенадцать миллионов шестьсот восемьдесят одна тысяча триста тридцать четыре) белорусских рубля.

Стоимость 1 м² сверхнормативной площади для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

Для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 616 145 (шестнадцать миллионов шестьсот шестнадцать тысяч сто сорок пять) белорусских рублей;

Для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 054 029 (шестнадцать миллионов пятьдесят четыре тысячи двадцать девять) белорусских рублей;

Для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

15 491 913 (пятнадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот тринадцать) белорусских рублей;

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства **для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся** в улучшении жилищных условий, предлагаются:

10 (десять) однокомнатных квартир;

10 (десять) двухкомнатных квартир;

10 (десять) трехкомнатных квартир.

Стоимость 1 м² жилья для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 616 145 (шестнадцать миллионов шестьсот шестнадцать тысяч сто сорок пять) белорусских рублей;

16 054 029 (шестнадцать миллионов пятьдесят четыре тысячи двадцать девять) белорусских рублей при единовременной оплате.

Стоимость 1 м² жилья для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 054 029 (шестнадцать миллионов пятьдесят четыре тысячи двадцать девять) белорусских рублей;

15 491 913 (пятнадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот тринадцать) белорусских рублей при единовременной оплате;

Стоимость 1 м² жилья для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

15 491 913 (пятнадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот тринадцать) белорусских рублей;

14 929 797 (четырнадцать миллионов девятьсот двадцать девять тысяч семьсот девяносто семь) белорусских рублей при единовременной оплате.

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере **20% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (Десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается до окончания строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору либо единовременно.

Оплата производится в белорусских рублях на специальный счет и расчетный счет застройщика.

Для заключения договоров необходимы:

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- справка о состоянии на учете граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, **с подтверждением отсутствия в собственности жилых помещений.**

Документы для заключения договоров будут приниматься с 29.12.2014 г. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (Пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по телефону: 306-07-26

С момента опубликования проектной декларации утрачивает силу проектная декларация, опубликованная в газете «Звязда» от 12.12.2014 года №236 (27846).

ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь 09 декабря 2014 г.

Приорбанк RZB Group

УТВЕРЖДЕНО
Протоколом Наблюдательного Совета
«Приорбанк» ОАО
«30» октября 2014 г. №10

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций «Приорбанк» Открытого акционерного общества 27-го, 28-го, 29-го выпусков

1. Наименование эмитента (на белорусском и русском языках):
На белорусском языке:
полное — «Прыорбанк» Адкрытае акцыянернае таварыства;
сокращенное — «Прыорбанк» ААТ.
На русском языке:
полное — «Приорбанк» Открытое акционерное общество;
сокращенное — «Приорбанк» ОАО.

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (E-mail):
Юридический и почтовый адрес: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А, тел./факс 289-90-90. Электронный адрес: info@priorbank.by.

3. Сумма зарегистрированного уставного фонда:
Размер зарегистрированного уставного фонда составляет 412 279 277 350 (Четыреста двенадцать миллиардов двести семьдесят девять миллионов двести семьдесят семь тысяч триста пятьдесят) белорусских рублей.

4. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии, а также сроки их публикации:
Периодическое печатное издание газета «Звязда».
Публикация бухгалтерской отчетности эмитента проводится не позднее 31 марта года, следующего за отчетным.
Публикация о внесенных изменениях в проспект эмиссии проводится не позднее семи дней с момента регистрации таких изменений в регистрирующем органе.
Публикация о реорганизации или ликвидации эмитента либо о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) проводится в сроки, определенные действующим законодательством.

5. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента, место его нахождения, дата, номер государственной регистрации и наименование регистрирующего органа, номер специального разрешения (лицензии) на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, срок действия специального разрешения (лицензии):
Наименование депозитария – «Приорбанк» ОАО.
Юридический и почтовый адрес – 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А.
Дата и место государственной регистрации – зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 12 июля 1991 г. под номером 12.
Специальное разрешение (лицензия) № №02200/5200-1246-1080 на право осуществления Профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, зарегистрирована в реестре лицензий за № 5200-1246-1080, выдана Министерством финансов Республики Беларусь. Срок действия лицензии – до 30.05.2021 г.

6. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование регистрирующего органа:
«Приорбанк» Открытое акционерное общество зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 12 июля 1991 года под номером 12.

7. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение:
Решение о 27, 28, 29 выпуске облигаций принято Наблюдательным советом «Приорбанк» ОАО 30 октября 2014 г. №10.

8. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии):
Ознакомиться с подробной информацией (проспектом эмиссии) о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:
- в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 12.30 и с 13.15 до 16.00,
- в информационном центре «Приорбанк» ОАО (ежедневно кроме выходных и праздничных дней): по телефону +375 17 289 90 90, 187 (в Минске), 487 (для абонентов Velcom, Life :), МТС).

9. Цель выпуска облигаций и направление использования средств, полученных от размещения:
Привлечение денежных средств юридических лиц (резидентов и нерезидентов Республики Беларусь) для формирования ресурсной базы банка.

10. Объем эмиссии, количество и форма выпуска облигаций и связанные с ними права:
Банк осуществляет эмиссию именных, процентных, бездокументарных, конвертируемых облигаций:

№ выпуска	Объем эмиссии, белорусских рублей	Количество, штук	Серия, номера
27	430 000 000 000 (Четыреста тридцать миллиардов)	4 300 000 (Четыре миллиона триста тысяч)	**ПР-27** с 0000001 по 4300000
28	430 000 000 000 (Четыреста тридцать миллиардов)	4 300 000 (Четыре миллиона триста тысяч)	**ПР-28** с 0000001 по 4300000
29	430 000 000 000 (Четыреста тридцать миллиардов)	4 300 000 (Четыре миллиона триста тысяч)	**ПР-29** с 0000001 по 4300000

Облигации выпускаются в бездокументарной форме (в виде записей на счетах).
Владелец облигации имеет право на получение по ней номинальной стоимости, выплачиваемой при погашении облигации, а также на получение дохода в виде процентного дохода, начисляемого на номинальную стоимость облигаций.

11. Номинальная стоимость:
Номинальная стоимость одной облигации 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

12. Период проведения открытой продажи облигаций:
Дата начала продажи: с 29 декабря 2014 года по 24 декабря 2019 года.

13. Место и время проведения открытой продажи облигаций:
Продажа облигаций осуществляется в «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А с 9.00 до 16.00 в рабочие в Республике Беларусь дни и/или на торгах ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В день начала открытой продажи облигации продаются по номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, облигации продаются по текущей стоимости.

14. Срок обращения облигаций и период начисления процентов:
Срок обращения облигаций: с 29 декабря 2014 года по 27 декабря 2019 года (1824 календарных дня).
Дата погашения облигаций: 27 декабря 2019 года.
Период начисления процентов: с 30 декабря 2014 года по 27 декабря 2019 года (с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату начала погашения включительно).

15. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций:
Для погашения облигаций владельцу необходимо осуществить перевод всего количества погашаемых бездокументарных облигаций данного выпуска на счет «депо» «Приорбанк» ОАО №600100000225, раздел №31 в депозитарии «Приорбанк» ОАО, код 002, корсчет «депо» ЛОРО №1000002, раздел корсчета «депо» ЛОРО №00 с основанием перевода: «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением» не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца облигаций (выплаты владельцу облигаций) денежных средств, необходимых для погашения облигаций.
При совпадении даты погашения с выходными или праздничными днями перевод производится на следующий рабочий день.
Погашение облигаций осуществляется 27 декабря 2019 года.
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО. Дата формирования реестра для погашения – 24 декабря 2019 года. С даты формирования реестра для погашения владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев облигаций в дату погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций.
В случае отсутствия в реестре реквизитов счета владельцев облигаций, открытого в уполномоченном банке Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, подлежащая выплате сумма выплачивается путем депонирования ее на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
Обязанность по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета Эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

16. Условия и размер выплаты дохода по облигациям и порядок его определения, даты формирования реестра владельцев облигаций:

Выпуск	Процентная ставка по выпуску
ПР-27	действующая ставка рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь плюс 1% годовых
ПР-28	действующая ставка рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь
ПР-29	действующая ставка рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь минус 1% годовых

Выплата дохода по облигациям осуществляется в белорусских рублях в виде процентного дохода за процентный период.
Даты выплат процентного дохода, даты начала процентного периода и даты формирования реестра владельцев облигаций:

№ процентного периода	Даты формирования реестра владельцев облигаций	Даты выплат процентного дохода/дата начала процентного периода
	-	29.12.2014
1	27.03.2015	30.03.2015
2	26.06.2015	29.06.2015
3	25.09.2015	28.09.2015
4	25.12.2015	28.12.2015
5	25.03.2016	28.03.2016
6	24.06.2016	27.06.2016
7	23.09.2016	26.09.2016
8	22.12.2016	26.12.2016
9	23.03.2017	27.03.2017
10	23.06.2017	26.06.2017
11	21.09.2017	25.09.2017
12	20.12.2017	25.12.2017
13	21.03.2018	26.03.2018
14	20.06.2018	25.06.2018
15	19.09.2018	24.09.2018
16	19.12.2018	24.12.2018
17	21.03.2019	26.03.2019
18	21.06.2019	26.06.2019
19	21.09.2019	26.09.2019
20	24.12.2019	27.12.2019 (выплата процентного дохода и погашение облигаций).

В период от даты формирования реестра владельцев облигаций (не включительно) по дату выплаты процентного дохода (не включительно) может также проводиться обращение облигаций на вторичном рынке, в данном случае процентный доход будет выплачен владельцу облигаций, указанному в реестре на дату формирования реестра владельцев облигаций.
Расчет дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период выплаты дохода по установленной процентной ставке по выпуску.
Расчет дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Д = \frac{Нп \times Пд1 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + Нп \times Пд2 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + ... + Нп \times ПдN \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366})}{100}$$

где: Д – переменный процентный доход по облигациям;
Нп – номинальная стоимость процентных облигаций;
Пд1, Пд2, …ПдN – ставка дохода (процентов годовых) за соответствующую часть периода, в пределах которого величина используемого для определения процентного дохода показателя была неизменной, установленная эмитентом;
Т365 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления процентного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Формула расчета накопленного процентного дохода по облигациям аналогична формуле расчета дохода по облигациям (указанной выше). При этом, количество дней первого процентного периода определяется с даты начала открытой продажи облигаций по дату расчета их текущей стоимости, при этом день начала открытой продажи облигаций и день расчета текущей стоимости считается одним днем. По второму и последующим процентным периодам количество дней процентного периода определяется с даты начала соответствующего процентного периода по дату расчета текущей стоимости облигаций, при этом начало соответствующего процентного периода и день расчета текущей стоимости считаются одним днем.
Текущая стоимость процентных облигаций рассчитывается по формуле:

$$С=Нп+Дн$$

где:
С – текущая стоимость процентных облигаций;
Нп – номинальная стоимость процентных облигаций;
Дн – процентный доход по облигациям (накопленный).
При совпадении даты выплаты процентного дохода или даты погашения облигаций с выходными или праздничными днями, выплата производится на следующий рабочий день, проценты за указанные дни не начисляются.

17. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании выпуска облигаций несостоявшимся, запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь:
«Приорбанк» ОАО в месячный срок с момента получения от регистрирующего органа уведомления о запрете выпуска ценных бумаг возвращает инвесторам средства (включая накопленный процентный доход за период нахождения облигаций в собственности инвестора по ставке указанной в п.16 настоящей краткой информации), полученные в оплату размещенных ценных бумаг, и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.
Эмитент не планирует отказ от выпуска ценных бумаг.

18. Дата и номер государственной регистрации облигаций:
Выпуск ПР-27: № 5-200-02-2399 от 09 декабря 2014 г.
Выпуск ПР-28: № 5-200-02-2400 от 09 декабря 2014 г.
Выпуск ПР-29: № 5-200-02-2401 от 09 декабря 2014 г.

19. Информация об обеспечении облигаций и другие условия выпуска:
Выпуск облигаций согласован с Национальным Банком Республики Беларусь 18 ноября 2014 г. Постановление №702. Размер обязательств по облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала. Собственный (нормативный) капитал «Приорбанк» ОАО по состоянию на 01 октября 2014 года равен 3 042 240,1 млн. руб. Эмитент осуществляет выпуск облигаций в пределах данных ограничений. Замена обеспечения исполнения обязательств по настоящему выпуску не предусмотрена.

20. Порядок перехода права собственности на облигации на вторичном рынке, условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала погашения:
Эмитент имеет право выкупить облигации на вторичном рынке для дальнейшей продажи среди юридических лиц (резидентов и нерезидентов Республики Беларусь).
На вторичном рынке облигации покупаются и продаются среди юридических лиц по договорной цене.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении на вторичном рынке (в том числе, приобретение облигаций эмитентом) осуществляется в установленном законодательством порядке через торговую систему открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» и/или на внебиржевом рынке, путем заключения соответствующего договора, в любые дни, кроме выходных дней, праздничных дней, дат выплаты процентного дохода, дат формирования реестра владельцев облигаций, если иное не установлено законодательством и решением о выпуске данных облигаций.
Выкупленные облигации могут быть досрочно погашены по решению Эмитента.
В соответствии с законодательством Республики Беларусь владельцами облигаций могут быть юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь.

21. Порядок и условия конвертации облигаций в облигации другого выпуска с более поздней датой погашения:
Конвертация облигаций осуществляется на основании письменного согласия владельца облигаций с последующим заключением соответствующего договора.
Конвертация облигаций выполняется:
А. До даты окончания срока обращения настоящего выпуска облигаций. Операция проводится в отношении лиц, давших письменное согласие на конвертацию облигаций. Письменное согласие владельца облигаций на их конвертацию должно быть предоставлено эмитенту не позднее двух рабочих дней со дня направления эмитентом предложения посредством факсимильной связи владельцам облигаций с последующим представлением оригинала в течение 3-х банковских дней. Конвертация облигаций осуществляется в день и на условиях, указанных в предложении эмитента. Заключение соответствующих договоров между эмитентом и владельцем облигаций осуществляется в день, указанный в предложении эмитента.
Б. При погашении облигаций настоящего выпуска. Конвертация проводится в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием «Приорбанк» ОАО на дату погашения облигаций, указанную в пункте 15 настоящей Краткой информации, и давших письменное согласие на конвертацию облигаций. Конвертация осуществляется в дату погашения облигаций. Письменное согласие владельца облигаций на их конвертацию должно быть предоставлено эмитенту не позднее дня, предшествующего дате погашения облигаций. Заключение соответствующих договоров между эмитентом и владельцем облигаций осуществляется в день и на условиях, указанных в предложении эмитента.
При конвертации облигаций Владелец облигаций не позднее рабочего дня, следующего за днем зачисления на его счет «депо» облигаций, размещаемых путем конвертации облигаций предыдущих выпусков, обязан осуществить перевод облигаций предыдущего выпуска (погашаемых облигаций) на счет «депо» эмитента.

22. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций:
Инвесторы, желающие приобрести облигации, перечисляют Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940 в Банке, код 749, в соответствии с договором продажи.
Расчеты при продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Председатель Правления **С.А.Костюченко**

Главный бухгалтер **В.В.Манцивода**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

КУДП «УКС Московского района г. Минска» УНП 190579681

ИНФОРМИРУЕТ

об аннулировании публикации проектной декларации по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1». Жилой дом № 4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями», опубликованной в газете «Звязда» № 241 (27851) от 19.12.2014.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ УНП 190579681

по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану»

Застройщик – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Московского района г. Минска» доводит до сведения заинтересованных лиц о **приостановлении действия проектных деклараций в части приема заявлений на свободные квартиры** по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану», опубликованных в газетах «Звязда» № 243 за 27.12.2013, № 6 от 15.01.2014, № 41 от 05.03.2014, № 161 от 27.08.2014, № 171 от 10.09.2014, № 174 от 13.09.2014, № 194 от 11.10.2014.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие настоящей.

■ На слыху

ЗДЗІВІЦЬ ЗА 300 СЕКУНДАЎ

Чым плануюць «узяць» журы і гледачоў прэтэндэнты на «Еўрабачанне»?

Ужо на наступным тыдні, увечары 26 снежня, адбудзецца гала-канцэрт фіналістаў нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне», па выніках якога ў фаворы застанецца толькі адзін з пятнаццаці — той (ці тая або тыя), хто і прадставіць налета Беларусь на конкурсе.

Большасць з гэтых артыстаў і калектываў ужо добра знаёмыя шырокаму колу гледачоў, але пра некаторых публіка дагэтуль не можа зразумець, хто гэтыя людзі. «Звязда» вырашыла пазнаёміць усіх ахвотных з фіналістамі бліжэй і распытала саміх артыстаў, чым за 3 хвіліны, што доўжыцца нумар, можна ўразіць суддзяў і аўдыторыю ў самае сэрца. А для большай зручнасці мы падзялілі ўдзельнікаў на некалькі ўмоўных груп:

«СТАРАЖЫЛЫ»

Пальма першынства ў гэтай групе, безумоўна, належыць **Гюнеш**. Для спявачкі, якая бярэ ўдзел у адборы з 2005 года, сёлетні фінал будзе ўжо шостым (!). Пасля шэрагу няўдач, калі Гюнеш заставалася літаральна ў адной прыступцы ад перамогі, і пасля леташняга бліскучага выступлення на альтэрнатыўным конкурсе Turkvision многія былі ўпэўнены, што артыстка наогул кінула гэту справу.

— Насамрэч мяне ўгаварыў муж, — прызналася спявачка. — Ён сказаў: «Ты нічога не губляеш, калі не пройдзеш, а галоўнае — я ж бачу, ты атрымліваеш ад гэтага задавальненне».

У фінале Гюнеш выканае абсалютна фарматную для конкурсу баладу «I believe in a miracle», музыку да якой напісала сама, а на сцэне кампанію ёй складуць бэк-вакалісты і, магчыма, ветрадуй.

Не менш вопытны баец «Еўрабачання» і **Жанет**, якая пасля адбору 2004 года (першы раз, калі Беларусь удзельнічала ў конкурсе) шмат разоў змяніла імідж і музычны кірунак. Летась яна ўразіла вельмі простым, але эфектным нумарам з пераадзяваннем на сцэне — цікава, што рыхтуе сёлета?

— На гэты раз пераадзявання не будзе, — смяецца Жанет. — Задум для нумара насамрэч было вельмі многа, і ўсе незвычайныя, але не ўсе падыходзяць для сцэны, на якой пройдзе канцэрт. Пакуль што працуем, днямі ўжо атрымалі пэўны рэквізіт з-за мяжы, дызайнер таксама запэўніла, што ў яе ўсё ў парадку. А яшчэ на наступным тыдні прыляцяць са Швецыі дзяўчаты — аўтаркі песні «Supernova», якія будуць са мной на сцэне ў якасці бэк-вакалістак.

Трэці ў «ветэранскім» спісе — гурт **Rostany**. Не здзіўляйцеся, калі гэтая назва вам незнаёмая. Насамрэч вакаліст калектыву Віктар Рудзянка, перш чым перайсці ў электрахаўс, вывеў на вялікую сцэну гурт Dali, з якім, між іншым, тройчы ўваходзіў у фінал нацыянальнага адбору, але ўсё чагосьці не хапала для пераканаўчага выступлення. На гэты раз, паводле слоў менеджара калектыву, рыхтуецца брутальны нумар: «Мы адзіны бойз-бэнд сярод фіналістаў, таму наша задача — раскрыць сапраўдную мужчынскую прыгажосць.

Гэтым і будзем здзіўляць. Ёсць некалькі крэатыўных задумак (напрыклад, звязаных з робатамі), але ўсё залежыць ад таго, як успрымуць нашы ідэі арганізатары. Рыхтуем таксама харэаграфічную пастаноўку, але заўзята танчыць хлопцы не будуць, усё ж яны «прывязаны» да інструментаў — спадзяюся, танчыць пад нашу завадную песню «Electric Toys» будуць гледачы!».

РЭГІЁНЫ

Пра некалькіх удзельнікаў мала вядома проста таму, што яны рэдка «свецяцца» ў сталічнай эстраднай тусоўцы, бо жывуць і працуюць у рэгіёнах. Так, гурт **Muzzart**, які мае ўжо 12-гадовы сцэнічны вопыт і мноства музычных узнагарод і прэмій у кожнага з 6 музыкантаў, родам з Брэста. Яны — гэта і джаз, і сальса, і румба, і кавер-версіі сучасных хітоў, запатрабаваных як у «рэстаранным» фармаце, так і на канцэртах. Уражваць збіраюцца завадным электрасвінгам у стылі Амерыкі 20-х гадоў.

Дзявочае трыа «**Беатрыс**» — з Магілёва. Тры сяброўкі-спявачкі, за плячыма якіх, між іншым, праца ў абласной філармоніі, заявілі аб сабе яшчэ ў 2012 годзе — праўда, не на радзіме, а ва Украіне, дзе бліскуча выступілі на шоу «Х-фактар». У беларускіх жа творчых конкурсах дзяўчаты часам чулі прысуд «нефармат». Чым збіраюцца здзівіць прыхільніцы стылю соўл аматараў «Еўрабачання»? Артысткі толькі загадкава ўсміхаюцца і абяцаюць, што не расчаруюць.

Яшчэ адна ўраджэнка Магілёва, **Tasha ODI**, таксама здабыла вядомасць за межамі роднага горада дзякуючы ўдзелу ў мюзікле Ілы Алейнікава «Прарок», дзе выконвала галоўную жаночую партыю. Акрамя таго, Наталля Адзінцова (гэта пашпартнае імя спявачкі), якая жыве цяпер у Маскве, паспяхова рэалізуе сябе ў бізнесе і ў творчасці, а пару гадоў таму прымала ўдзел і ў расійскім адборы на «Еўрабачанне». Дарэчы, цікавая дэталь: у цяперашніх конкурсных песень Наталлі і Жанет — адны і тыя ж шведскія аўтары.

НАВІЧКІ

Некаторыя з сёлетніх фіналістаў гучна заявілі аб сабе параўнальна нядаўна. Напрыклад, **Валерыя Садоўская** толькі летась перамагла ў тэлепраекце «Акадэмія талентаў» і пакуль што мае ў актыве не надта шмат канцэртных выступленняў, таму ў падрыхтоўцы нумара дзяўчына разлічвае найперш на свайго настаўніка і прадзюсара Леаніда Шырына.

Гурт **Napoli** мае крыху больш як двухгадовую гісторыю. Летась калектыў ужо ўваходзіў у фінал нацыянальнага адбору, але пазней пасля трагічнай гібелі свайго тагачаснага саліста Ілы Краўчука апынуўся наогул пад пагрозай роспуску. Тым не менш, сабраўшыся з сіламі, у абноўленым складзе трыа працягвае штурм «Еўрабачання» і сёлета, прысвяціўшы сваю песню «My dreams» памяці сябра.

Але, бадай, самым нашумелым — задоўга да свайго з'яўлення — стаў дзявочы гурт **MILKI** (мінчанкі Таццяна Стахоўская і Ганна Рай, Вікторыя Назарко з Гродна, Таісія Серыкава з Гомеля і Марына Путнікава з Горак), які спецыяльна для ўдзелу ў конкурсе сабраў пераможца «Еўрабачання-2009» Аляксандр Рыбак і напісаў для іх песню пра адметнасць і прыгажосць беларускага акцэнту. Ходзяць чуткі, што ў фінале Аляксандр складзе сваім падапечным кампанію на сцэне… «Не, такога дакладна не будзе, — абвяргае Дзіяна Вашкель, PR-менеджар прадзюсарскага цэнтра, які прадстаўляе інтарэсы Рыбака ў СНД. — Сам нумар у параўнанні з праслухоўваннем дакладна зменіцца: Саша прапанаваў вельмі прыгожую харэаграфічную пастаноўку, над якой дзяўчаты цяпер працуюць. Дарэчы, нягледзячы на тое, што Аляксандру даводзіцца шмат працаваць, ён пастаянна трымае сувязь з групай і пільна сочыць за работай. А яшчэ адзначу такі прыемны момант, што нас падтрымаў Філіп Кіркораў, які напісаў у сацыяльных сетках прыязны водгук, і пераможца «Еўрабачання-2007» Марыя Шэрыфавіч. Паколькі гэта апошняя з пераможцаў, хто спяваў на сваёй нацыянальнай мове, Саша вельмі ўзрадаваўся і палічыў гэта добрым знакам».

ХЛОПЦЫ

Салістаў у фінале ўсяго трое. Падапечны прадзюсара Уладзіміра Кубышкіна баяніст **Віталь Варанко** адзначыўся не толькі ў «Акадэміі талентаў» і леташнім адборы на «Еўрабачанне», але таксама фурорам у польскім шоу «Голас» і ўдалымі эксперыментамі з беларускамоўным рэпертуарам. На конкурс, праўда, прадставіць рускамоўную кампазіцыю «Драйв». І баян — куды ж без яго.

Саліст прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» **Аляксей Грос** на вялікай сцэне гучных поспехаў пакуль што не дэманстраваў — паціху спрабуе сілы ў розных конкурсах. Затое ў леташнім адборы ён праявіў сябе як сапраўдны мужчына і адказны прафесіянал, зняўшы ўжо ўхваленую заяўку, якая парушыла правілы.

Нямногія памятаюць, але **Дзяніса Ліса** можна таксама назваць «старажылам» адбору на «Еўрабачанне», бо першы раз ён далучыўся да ўдзелу яшчэ ў 2007 годзе, дапамагаючы Дзмітрыю Калдуну напісаць песню «Анёл мары». Песню ў выніку замянілі, але затое Дзіма паказаў найлепшы з усіх беларусаў вынік на конкурсе — 6-е месца. А Дзяніс Ліс, які сёлета, дарэчы, таксама выступіў на «Еўрабачанні» (як бэк-вакаліст Тэа), вырашыў нарэшце выйсці з ценю — і цяпер ужо сябар дапамог яму з запісам песні пад назвай — будзеце смяяцца — «Angel». «Усё развіваецца па спіралі», — усміхаецца Дзяніс, прызнаючыся, што ўдзел у «Еўрабачанні» сапраўды зацягвае, і ён адчувае ў сабе сілы для таго, каб зноў выйсці на сцэну форума, але ўжо як галоўная дзеючая асоба.

«НЕПРАДКАЗАЛЬНЫЯ»

Юрый Наўроцкі, ён жа **Uzari**, некалькі раз штурмаваў адбор — і спыняўся ў кроку ад поспеху. А сёлета, глыбнуўшы напоўніцу «еўрабачанскай» атмасферы падчас дзіцячага конкурсу (ён выступаў аранжыроўшчыкам песні беларускай удзельніцы), раптам узяў і ўсіх здзівіў — падаў заяўку зноў, прычым

нечакана ў тандэме са скрыпачкай **Маймунай**. Атрымалася смела, энергічна і надзіва прыгожа. «У фінале будзе не горш, — абяцае артыст. — Песню дапрацоўваць не будзем — пастараемся наогул зрабіць усё загадзя, каб на сцэне атрымліваць кайф ад выступлення. А сам наш нумар можна апісаць адным словам — «будучыня».

А вось спявачка **Дарыя**, наадварот, збіраецца цалкам перапрацаваць конкурсны нумар на песню «Love is my color», музыку да якой напісала яна сама. І чаго ад яе чакаць, не прызнаецца.

Невядома пакуль, і чаго чакаць ад **Настассі Малашкевіч**. Падапечная Паўла Клышэўскага ўражвае моцным голасам і яркай харызмай, але на фоне мноства такіх жа жаночых балад можа як згубіцца, так і «стрэліць» у апошні момант.

Вопытныя прадзюсары і ўдзельнікі мінулых адбораў дагэтуль не бяруцца рабіць прагнозы на чыюсьці адназначную перамогу, адгаворваючыся, што ўсё вельмі заблытана. А вы ўжо вызначыліся са «сваім» кандыдатам?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара, БЕЛТА.
Усе здымкі глядзіце на сайце zviazda.by

Даты Падзеі Людзі — 20 СНЕЖНЯ

1796 год — нарадзіўся Тамаш Зан, паэт, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў віленскіх тайных таварыстваў і студэнцкай моладзі. У 1823 годзе арыштаваны і высланы ў Арэнбург, дзе вёў дзённік, даследаваў прыроду Урала, стварыў мінералагічны музей. З 1841 года жыў у Беларусі. Вывучаў беларускі фальклор. Аўтар паэм «Котка», «Мёд», балад «Твардоўскі», «Свіцязь-возера» і іншых. Сябраваў з А. Міцкевічам, аказваў уплыў на яго творчасць. Памёр ў 1855 годзе.

1840 год — нарадзіўся (вёска Дамброва, цяпер Шчучынскі раён) Казімір Альхімовіч, беларускі жывапісец, ілюстратар. Прадстаўнік позняга рамантызму і рэалізму ў беларускім жывапісе XIX — пачатку XX ст. Вучыўся ў Віленскай гімназіі. За ўдзел у паўстанні 1863-1864 гг. сасланы ў Сібір. Пасля вяртання жыў у Варшаве, дзе прайшоў курс навучання ў мастацкая школе. Пазней з адзнакай скончыў Мюнхенскую акадэмію мастацтваў. У 1876-1878 гадах жыў у Парыжы. Удзельнічаў у выставах Варшаўскага таварыства заахвочвання мастацтваў і Салона ў Парыжы. Працаваў ў міфалагічным, гістарычным, партрэтным жанрах. Праявіў сябе як майстар эмацыйна-псіхалагічнага ладу. Аўтар гістарычных палотнаў: «Пахаванне Гедыміна», «Пасля бітвы», «Смерць Глінскага ў турме» і інш. Па матывах творчасці А. Міцкевіча стварыў серыю карцін і 12 ілюстрацый да яго паэмы «Пан Тадэвуш». Вядомы як ілюстратар твораў Ю. Славацкага і Ю. Крашэўскага. Памёр у 1916 годзе.

1903 год — у Вільні на 1-м установочым з'ездзе Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) створана першая беларуская нацыянальна-дэмакратычная партыя сацыялістычнай арыентацыі.

Было сказана

Ян СКРЫГАН, пісьменнік, навеліст, публіцыст:
«Сябры не набіраюцца гадамі. Іх ніколі не бывае так многа, каб сказаць, што сяброў ужо досыць».

НАРОДЖАНЫЯ 20 снежня

Іх неверагодная вынаходлівасць, эфектыўнасць у працы і арыгінальнасць настолькі высокія, што гэта выклікае здзіўленне. Ім добра ўдаецца кантраляваць сваю псіхічную энергію. Разам з тым, яны бываюць вельмі агрэсіўнымі ў адстойванні сваіх асабістых ідэй і думак. Яны, самі нястомныя працаўнікі, патрабуюць ад дзяцей і вучняў такіх жа намаганняў і аддачы. Таму такім людзям неабходна ўтаймаваць сваю энергію, што дапаможа ім лепш разумець навакольных.

НАРОДЖАНЫЯ 21 снежня

У гэты дзень нараджаюцца моцныя асобы. З гэтымі людзьмі спрачацца практычна немагчыма, настолькі яны непахісныя ў дасягненні асабістых ідэалаў; звычайна яны не любяць расказваць пра сябе, адказваць на пытанні, якія тычацца асабістага жыцця. Нягледзячы на гэта, яны здольныя на цёплыя адносіны з тымі, каго кахаюць; яны звычайна валодаюць вялікай фізічнай сілай і сваім целам. Ім неабходна навучыцца прабачаць і быць больш цярплівымі да іншых. Для эфектыўнага духоўнага росту ім неабходна пазбавіцца страху быць не прынятымі, пазбягаць нерашучасці ва ўчынках, падазронасці, утаймаваць сваё непамернае жаданне быць аб'ектам захаплення і зачаравання.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

СВЯТА НА ПАРОЗЕ

Ядомая ялінка

Іх можна размясціць на святочным стале або падарыць родным, сябрам і калегам.

Спатрэбіцца. *Для цеста: 1 шклянка размякчанага масла (200 г), 1 шклянка цукру, 2 ч.л. разрыхляльніка, 2 ч.л. молатага імбіру, 1 ч.л. соды, 1 ч.л. молатай карыцы, 0,5 ч.л. молатай гваздзікі, 1 шклянка цукровага сіропу (рэцэпт ніжэй), 2 яйкі, 2 ч.л. воцату, 5 шклянак мукі (прыкладна). Для цукровага сіропу: 200 г цукру, 200 г мёду, 1/3 шклянкі кіпеню. Для карамельнага клею: 100 г цукру, 0,5 л вады.*

Перш за ўсё прыгатуйце цукровы сіроп. У металічнай каструлі растапіце 3 ст.л. цукру да карычневага колеру. Зніміце з агню і трохі астудзіце, памешваючы. Уліце 1/3 шклянкі кіпеню, добра размяшайце, усыпце астатні цукар і пастаўце на агонь. Давядзіце да кіпення і да поўнага растварэння цукру. Дадайце мёд і размяшайце. У вялікай каструлі ўзбіце міксерам масла. Дадайце разрыхляльнік, імбір, соду, карыцу і гваздзіку. Працягваючы ўзбіваць, паступова ўліце цукровы сіроп, убіце яйкі і дадайце воцат, муку. Пасыпце мукой рабочую паверхню, выкладзеце на яе цеста і працягвайце мясіць рукамі. Цеста павінна атрымацца вельмі густым. Падзяліце на часткі, накрыйце і пастаўце ў халадзільнік на 3 гадзіны.

Пакуль цеста астуджаецца, зробім трафарэты. Намалюйце на кардоне контуры елкі. Правядзіце вертыкальную цэнтральную лінію. З двух бакоў ад цэнтральнай лініі на адлегласці 1 см правядзіце паралельныя лініі. Цяпер, зрабіце яшчэ два лісткі з контурамі ялінкі і тры цэнтральнымі лініямі. У выніку вы атрымаеце тры шаблоны для трох частак аб'ёмнага імбірнага перніка. Вымерайце вышыню ялінкі, пачынаючы ад ніжняга краю галінак, — гэта будзе значэнне X. Падзяліце яго на 3, затым памножце на 2 і дадайце 6 мм. Вы атрымаеце значэнне Y. Падзяліце яго напалам — і атрымаеце Z. Запішыце значэнні Y і Z. На першым шаблоне правядзіце лінію на адзнацы Y і пазначце адлегласць ад гэтай лініі да нізу ялінкі. На другім шаблоне правядзіце гарызантальныя лініі праз вышыні Y і Z і пазначце адлегласці вышэй Y да верху і ніжэй Z да асновы. На трэцім шаблоне павінна быць пазначана адлегласць вышэй Z да верху елкі. Выражце шаблоны па контуры.

Раскачайце цеста таўшчынёй 5-6 мм паміж двума лістамі паперы для выпечкі, перанясіце на дошчачку і пастаўце на 10 хвілін у халадзільнік. Зніміце верхні ліст пергаменту. Пасыпце цеста і адваротны бок кардону невялікай колькасцю мукі і выражце ялінку з цеста па контуры з дапамогай шаблону. Выразаныя дэталі не перамяшчайце па пергаменце. Замест цеста проста пазбаўцеся ад непатрэбнага цеста вакол іх і адпраўце пергамент з дэталямі ў халадзільнік яшчэ на 10 хвілін. Далей пакладзіце дэталі разам з пергаментам на бляху і выпякайце ў духоўцы пры тэмпературы 180 градусаў хвілін 15—20. Астудзіце на блясе. Калі пасля астывання вы заўважылі, што дэталі недастаткова цвёрдыя, пакладзіце іх у духоўку яшчэ на некалькі хвілін.

Карамельны клей — гэта, уласна, той жа цукровы сіроп (які мы гатавалі вышэй), але больш канцэнтраваны і без мёду. Каб ён не застыў, яго можна трымаць на каструлі з вадой, якая кіпіць.

Дэкор і збор дэталяў. Пэндзлікам нанясіце салодкі сіроп на краі дэталяў ялінкі і пасыпце зверху «снегам» дэкаратыўнай абсыпкі. Каля паўгадзіны «клей» павінен падсохнуць. Цяпер можна сабраць дэталі ў адно цэлае.

Заўвага. Калі зрабіць цеста для дэталяў ялінкі танчэйшым, то тады пазы таксама павінны быць вузейшымі. І наадварот, для тоўстага цеста пазы зрабіце шырэйшыя. Для ўпрыгожвання ялінкі таксама можна выкарыстоўваць айсінг. Абрэзкі цеста паслужаць для невялікіх упрыгожванняў, фігурак, пернікавых чалавечкаў і да т.п.

■ Помніць, шанаваць, ганарыцца

АБАРОНЦЫ

Песня «Абаронцы» Уладзіміра Мазго і Уладзіміра Будніка належыць да тых вакальных твораў, якія часта выконваюць ролю прачула ўспрынятых малітваў.

Створаная на пачатку новага тысячагоддзя, песня адразу ўлілася ў рознагалосую плынь армейскага жыцця. Яна гучыць велічна-маршава, панарамна ўзнаўляе гісторыю роднай зямлі, прасвятляючы душы маладых абаронцаў.

Кожнаму пакаленню выпадае вялікая адказнасць — прадоўжыць гераічныя справы дзядоў і прадзедаў, самаахвярна берагчы Мір, усталяваны імі. І робіцца гэта дзеля росквіту не толькі сваёй краіны, але і для ўсёй планеты, дзеля памнажэння Харастваі Любові.

Акрыляюць пагоны і завуць палігоны,
Чакае салдата пляц страявы.
Родны край, непаўторны для сваёй абароны,
Абуджае у сэрцы настрой баявы.

Прыпеў:

А мы з табою — абаронцы,
Любоў баронім у старонцы,
Не трэба зямлі нам чужой.
А мы з табою — абаронцы,
Любоў баронім салдацкай душой.

Мы Радзіме паслужым і навекі падружым,
Каб суседзі ўсе мірна, шчасліва жылі.
Раскрываюцца душы, як вясновыя ружы,
На сагрэтай любоўю бацькоўскай зямлі.

Прыпеў.

Тут дзяды ваявалі, кроў сваю пралівалі,
Каб трывожная памяць званіла ў званы.
Дні сталення насталі — абаронцамі сталі
Сёння ўнукі салдатаў апошняй вайны.

Прыпеў.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	9.26	16.48	7.22
Віцебск	9.23	16.30	7.07
Магілёў	9.16	16.38	7.22
Гомель	9.04	16.44	7.40
Гродна	9.39	17.05	7.26
Брэст	9.31	17.15	7.44

Месяц

Маладзік 22 снежня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Антона, Івана, Міхаіла, Ніла, Паўла, Сяргея.*
К. *Багумілы, Дамініка, Ігната, Тэафіла, Яўгена.*

Фота Сафі КУСЯНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+3..+5°С	КІЕЎ	+2..+4°С	РЫГА	0..+2°С
ВІЛЬНЮС	0..+2°С	МАСКВА	0..+2°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-2..0°С

УСМІХНЕМСЯ

Зрабіў бутэрброд: хлеб, сыр, лісцік салаты, каўбаса, карэйская морква, грудзінка. Сяджу і плачу: рот так шырока раскрыць не магу...

Адэса, дзень нараджэння:

— Што б табе, Ёсік, такога пажадаць, каб потым не надта зайздросціць?..

Пакуль Мікіта Джыгурда пад вокнамі радзільні пытаўся ў жонкі «ХТО?!», нарадзілі яшчэ 20 жанчын і ледзь не нарадзіў галоўны ўрач.

Кожны раз, калі іду за прыбіральшчыцай па мытай падлозе, адчуваю сябе злачынцам сусветнага маштабу.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.010. Індэкс 63850. Зак. № 5131.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 19 снежня 2014 года.